# УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ ПАЭТА

*Ігар Сцяпунін*

## ПУШКІНСКІ ЮБІЛЕЙ 1899 г. У МІНСКУ

Пушкінскія юбілеі для беларускага народа заўжды былі вялікім святам. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НА РБ) захаваліся матэрыялы аб святкаванні на беларускай зямлі стогадовага юбілею з дня нараджэння А. С. Пушкіна. На Віцебшчыне і Магілёўшчыне, як паведамлялі "Витебские губернские ведомости", усё насельніцтва як бы "ўз'ядналася ў адно неразрыўнае цэлае", каб належна ўшанаваць памяць вялікага рускага паэта, "святкаваў увесь народ — ад малапісьменнага да адукаванага, ад дзіцяці да старога" [1]. Святкаванне стогадовага пушкінскага юбілею — адна з яркіх старонак у гісторыі культурнага жыцця Мінска. У падрыхтоўчы да юбілею перыяд у горадзе ўзнікла Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў — "цэлае грамадства людзей адукаваных, развітых і натхнёных жаданнем згуртавацца разам для культурнай працы на карысць народа і славы Беларусі" [2]. Адным з арганізатараў яго выступіў старшы рэвізор Мінскага губернскага акцызнага ўпраўлення А. Ф. Аляксандраў, сям'я якога падтрымлівала сяброўскія адносіны з вялікай украінскай паэтэсай Лесяй Украінкай. У Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў уваходзілі прадстаўнікі розных грамадскіх плыняў, у тым ліку рэвалюцыйна-дэмакратычнай інтэлігенцыі, члены мінскай групы РСДРП, а сярод іх С. К. Мяржынскі, сябар Лесі Украінкі, адзін з першых прапагандыстаў марксізму на Беларусі. Аднак у 1899 г. таварыства займалася мірнай асветніцкай дзейнасцю. Яго ўдзельнікі наладжвалі спектаклі, у перспектыве намерваліся заснаваць у горадзе агульнадаступную чытальню, бібліятэку, школы музычную і жывапісу. Таварыства давала мінчанам "магчымасць за недарагую плату атрымліваць эстэтычныя веды" [3].

---

[1] НА РБ. Ф. 1416, воп. 6, спр. 605, т. 1, арк. 248, 270, 475.

[2] Тамсама. Спр. 798, арк. 376.

[3] Тамсама. Спр. 605, т. 1, арк. 116.

У сакавіку 1899 г. пры таварыстве ствараецца спецыяльная камісія з прадстаўнікоў розных устаноў для выпрацоўкі праграмы святкавання юбілею А. С. Пушкіна. Сябры камісіі распаўсюджвалі таксама творы паэта, у прыватнасці, асобнае выданне з ілюстрацыямі "Сказки о рыбаке и рыбке", якая карысталася ў Беларусі асаблівай папулярнасцю. Вядомы запісы гэтай казкі на беларускай мове, зробленыя ў 1888 г. інспектарам беластоцкага вучылішча М. П. Авенарыусам у розных паветах Мінскай губерні [4].

Камісія імкнулася задаволіць просьбу ўсіх навучальных устаноў Мінскай губерні асігнаваць сродкі на набыццё твораў А. С. Пушкіна і яго партрэтаў для раздачы навучэнцам, таму што, як высветлілася, "вучні не знаёмы з партрэтамі Пушкіна і ў вучнёўскай бібліятэцы няма твораў гэтага пісьменніка". Камісія распаўсюджвала ў вучылішчах Мінскай губерні некаторыя навуковыя выданні, напрыклад набор з 15 брашур пад назвай "Иллюстрированная пушкинская библиотека", выдадзены Ф. Ф. Паўлянковым. Кожная брашура ўключала асобны твор Пушкіна і яго партрэт [5].

Камісія таварыства намервалася выдаць паштоўкі ў памяць Пушкіна з малюнкамі вядомых рускіх мастакоў. Каб арганізаваць публічную лекцыю пра Пушкіна ў Мінску, камісія звярнулася ў Маскоўскае лекцыйнае бюро. Прачытаць лекцыю пра паэта згадзіўся прыват-дацэнт Маскоўскага універсітэта, вядомы пушкіназнаўца І. І. Іваноў. У сваіх навуковых працах ён абвінавачваў велікасвецкае грамадства ў гібелі Пушкіна, гаварыў аб цеснай сувязі паэта з яго сябрамі-дзекабрыстамі. Іваноў прыслаў у Мінск план сваёй лекцыі, якую меркавалі правесці 26 мая ў гарадскім тэатры для вучняў сярэдніх навучальных устаноў (бясплатна). Але лекцыя не была прачытана, таму што якраз у гэты дзень І. І. Іваноў павінен быў выступаць з прамовай на пушкінскім святкаванні ў Маскве. Іваноў выказаў жаданне прачытаць лекцыю ў Мінску ў іншы час: у чэрвені або жніўні 1899 г. Але па распараджэнню мінскага генерал-губернатара князя М. М. Трубяцкога лекцыя была забаронена, дазвалялася абмежавацца на ўрачыстым пасяджэнні толькі "вымаўленнем прамовы" пра Пушкіна. "Скласці прамову" было даручана члену камісіі А. Ф. Хаванскаму [6].

10 сакавіка камісія звярнулася да Мінскага гарадскога грамадскага ўпраўлення з хадайніцтвам аказаць ёй "сваё асвечанае садзейнічанне" і ўступіць памяшканне тэатра з электрычным асвятленнем "для правядзення 25, 26 і 27 мая свята ў гонар А. С. Пушкіна". Камісія таксама

---

[4] Гл.: Образцы белорусского наречия разных местностей, доставленные М. Авенариусом // Сборник II Отделения русского языка и словесности Академии наук. СПб., 1888. С. XIII.

[5] НА РБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 203, арк. 107, 160; спр. 234, арк. 167.

[6] Тамсама. Ф. 1, воп. 1, спр. 3542, арк. 14; ф. 295, воп. 1, спр. 390, арк. 1, 2, 19.

ставіла пытанне аб адкрыцці ў Мінску Публічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна, каб "тым самым назаўсёды захаваць у памяці народа імя вялікага рускага паэта". Уздымаецца і пытанне аб каштарысе на выпісванне бюста Пушкіна і пастамента для яго [7].

Для правядзення ўсіх гэтых мерапрыемстваў адкрываецца падпіска на збор ахвяраванняў у гонар юбілею. Актыўны ўдзел у гэтай кампаніі прымалі ўсе навучальныя ўстановы Мінскай губерні, жыхары павятовых гарадоў Міншчыны, не толькі гараджане, але і сяляне, служачыя Лібава-Роменскай чыгункі, афіцэры і салдаты армейскіх палкоў, што кватаравалі ў Мінскай губерні. Жыхары Слуцка і Мазыра, нягледзячы на тое, што рашылі адзначыць пушкінскі юбілей у сваіх гарадах, таксама далучыліся да падпіскі [8]. У выніку па 50 падпісных лістах было сабрана 1604 р. 44 кап. Усе сабраныя грошы перадалі казначэю таварыства для стварэння да юбілею Мінскай публічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. 28 чэрвеня Мінская гарадская дума пастанавіла адобрыць выпрацаваны камісіяй праект статута Мінскай гарадской публічнай бібліятэкі і даручыла гарадской управе прадставіць гэты праект мінскаму губернатару "з тым, каб па зацвярджэнні статута бібліятэка была неадкладна адкрыта". Адзначалася, што Мінску, з яго стотысячным насельніцтвам, востра неабходна мець сваю Публічную бібліятэку, "у якой інтэлігентныя жыхары маглі б прачытаць газету або кнігу, ажыццявіць такім чынам патрэбы для адукаванага чалавека ў такой ступені надзённай, як адзенне і ежа". Але статут гэтай бібліятэкі быў зацверджаны мінскім губернатарам толькі 20 чэрвеня, а сама бібліятэка адкрыта толькі 25 снежня 1900 г. [9]

26 мая 1899 г. у памяшканні Мінскага гарадскога тэатра (цяпер Беларускі драматычны тэатр імя Янкі Купалы) адбыўся святочны вечар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захавалася праграма гэтага вечара. Цікавы змест першага аддзялення праграмы: 1. Марш Мендэльсона (выконвае аркестр Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў). 2. Прамова пра Пушкіна (вымаўляе член таварыства А. Ф. Хаванскі). 3. Чытанне верша М. Ю. Лермантава "Смерть поэта". 4. Чытанне ўрыўкаў з паэмы "Полтава" 5. Хор з оперы А. С. Даргамыжскага "Русалка" (салісты — члены Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў). 6. Паказ жывой карціны "Пушкін у Міхайлаўскім".

Змест другога аддзялення: 1. Паказ жывой карціны "Кавказский пленник". 2. Чытанне верша Пушкіна "Вновь я посетил..." 3. Хор сялян з оперы П. І. Чайкоўскага "Евгений Онегин" (выконваюць члены

---

[7] НА РБ. Ф. 1, воп. 1, спр. 3542, арк. 1, 2; ф. 295, воп. 1, спр. 390, арк. 35.

[8] Тамсама. Ф. 295, воп. 1, спр. 390, арк. 150, 151, 170, 200.

[9] Тамсама. Ф. 24, воп. 1, спр. 3600, арк. 14; ф. 299, воп. 1, спр. 12598, арк. 1, 6.

Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў). 4. Чытанне верша Я. П. Палонскага, прысвечанага памяці А. С. Пушкіна. 5. Гімн А. Ф. Аляксандрава да стагоддзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна (выконвае хор Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў). 6. Чытанне верша Пушкіна "Я памятник себе воздвиг нерукотворный..." 7. Хор Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў выконвае "Славу" перад бюстам паэта [10].

З усёй праграмы на наведвальнікаў тэатра, як адзначаў "Минский листок" 26 мая 1899 г., асаблівае ўражанне зрабіў вядомы верш М. Ю. Лермантава "Смерть поэта", прачытаны А. Ф. Аляксандравым. Палітычная вастрыня лермантаўскага верша заўсёды непакоіла правячыя колы. Невыпадкова Міністэрства народнай асветы ў 1899 г. забараніла ўключаць гэты верш у праграму ўшанавання А. С. Пушкіна ва ўсіх навучальных установах Расійскай імперыі [11]. І тым не менш гэты верш быў асабліва папулярны сярод перадавой беларускай інтэлігенцыі. Калі на святочным пасяджэнні прагучалі палымяныя лермантаўскія радкі ("Погиб поэт — невольник чести..."), уся зала страпянулася, прагучалі бурныя апладысменты і воклічы "біс".

Святкаванне стагоддзя з дня нараджэння вялікага паэта ў Мінску і іншых беларускіх гарадах паказала, наколькі Пушкін блізкі і дарагі беларускаму народу. "Минский листок" 26 мая 1899 г. паведамляе, што "такой урачыстасці яшчэ не было ў нас. З самых глухіх гарадоў паступаюць звесткі пра ўшанаванне паэта..." "Тры дні, — гаворыцца ў адной з карэспандэнцый "Витебских губернских ведомостей", — працягваліся ўрачыстасці, прысвечаныя ўшанаванню памяці паэта. Здавалася, што дух гэтага вялікага чалавека і вялікага пакутніка, які стаў ахвярай ворагаў і варожых паклёпаў... нябачна прысутнічаў сярод нас і ачысціў нашы душы і сэрцы ад паўсядзённай брыдоты і мітусні. Чымсьці маладым, гарачым, узнёслым павеяла на нас у гэтыя дні, штосьці радаснае, светлае, шматабяцаючае мроілася нам" [12].

У той жа час гэтае святкаванне паказала, як ставіліся да Пушкіна царскія ўлады. Калі жыхары Мінска за кароткі тэрмін сабралі для Публічнай бібліятэкі каля дзвюх тысяч кніг, мінскі губернатар князь М. М. Трубяцкой не спяшаўся адкрыць гэту асветную ўстанову, якой надавалася імя А. С. Пушкіна. А бюст вялікага паэта з пастаментам так і не быў устаноўлены ў Мінску.

15 чэрвеня 1899 г. домаўладальнікі і жыхары Ляхаўскай вуліцы (цяпер вуліца Кастрычніцкая) звярнуліся ў Мінскую гарадскую ўправу з просьбай "для ўвекавечання памяці А. С. Пушкіна і ў выпадку святка-

---

[10] НА РБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 3900, арк. 5100.

[11] Гл.: Мейлах Б. Вопросы литературы и эстетики. Л., 1958. С. 346–347.

[12] НА РБ. Ф. 1416, воп. 6, спр. 606, арк. 1467.

вання стогадовага юбілею з дня яго нараджэння вуліцу Ляхаўскую, якая вядзе ад Магазіннай вуліцы (цяпер вуліца Кірава) да моста цераз раку Свіслач, перайменаваць у Пушкінскую". Гарадская ўправа, а таксама гарадская дума пастанавілі задаволіць просьбу жыхароў і домаўладальнікаў і "прадставіць аб гэтым адпаведнае хадайніцтва мінскаму губернатару". Але апошні "без тлумачэння прычын" 30 верасня наклаў на пастанову гарадскіх улад рэзалюцыю: "...не знаходжу магчымым задаволіць хадайніцтва Мінскай гарадской думы аб перайменаванні вуліцы Ляхаўскай... у Пушкінскую". Гарадской думе нічога не заставалася іншага, як "прыняць гэта да ведама" [13]. Просьба жыхароў вуліцы Ляхаўскай так і засталася незадаволенай, а справа "ўвекавечвання памяці А. С. Пушкіна" не даведзенай да канца.

У сваёй упартасці мінскі губернатар не быў адзінокі. Царскія ўлады ў шэрагу гарадоў Расіі давалі згоду называць імем Пушкіна навуковаасветныя ўстановы (школы, бібліятэкі, чытальні), але толькі не вуліцы, бульвары, скверы. Так, вядома, што Маскоўская гарадская дума ў 1899 г. адмовілася перайменаваць Цвярскі бульвар, дзе ў 1880 г. быў пастаўлены помнік паэту, у Пушкінскі [14].

Улады, натуральна, не маглі любіць Пушкіна за яго вальнадумства і не ставілі мэтай прапагандаваць у народзе творы вялікага паэта бунтарскага напрамку. Праз 16 гадоў пасля стогадовага пушкінскага юбілею, у 1915 г., прыстаў першай часці г. Мінска Радкевіч рашуча выступіў супраць дэманстравання ў кінематографе "Люкс" кінакарціны "Капитанская дочка (Емелька Пугачев)", створанай па аднайменнай аповесці А. С. Пушкіна [15]. У рапарце мінскаму паліцмайстару ад 15 лютага 1915 г. царскі прыстаў сцвярджаў, што "карціна па свайму зместу наогул... не пажадана да дэманстравання на экране". Хаця ў кінафільме вобразы Пугачова і яго паплечнікаў былі пададзены ў рэзка адмоўным плане, Радкевіч тым не менш бачыць такія "непажаданыя месцы", як паказ вісельні, якая была ўстаноўлена на рачным плыце. Ахоўнік парадку ў дадзеным выпадку прад'яўляе прэтэнзіі ўжо не да сцэнарыстаў, а да самога А. С. Пушкіна, таму што ў прапушчанай главе аповесці, якая была забаронена царскай цэнзурай, гаворыцца пра расправу царскіх карнікаў з бунтаўшчыкамі-пугачоўцамі.

Царскаму приставу таксама не спадабалася, што ў кінакарціне паказана "пакаранне смерцю каменданта крэпасці і іншых рускіх афіцэраў". Стужка, на думку Радкевіча, "не адпавядае моманту, што пера-

---

[13] НА РБ. Ф. 1, воп. 1, спр. 3503, арк. 1–7.

[14] Гл.: Берков П. Н. Из материалов пушкинского юбилея 1899 г. // Пушкин: Временник пушкинской комиссии. М.; Л., 1937. С. 404.

[15] Гл.: Вишневский В. Художественные фильмы дореволюционной России (Фильмографическое описание). М., 1945. С. 41.

жываецца". Меўся на ўвазе перыяд першай сусветнай вайны, калі на тэрыторыі Беларусі разгарнуліся ваенныя дзеянні, а таксама развіваўся рэвалюцыйны рабочы рух супраць царскага самадзяржаўя [16]. У гэты час царскія ўлады забаранялі распаўсюджванне ў Беларусі тых твораў А. С. Пушкіна, у якіх гаворыцца пра барацьбу народа з прыгнятальнікамі.

Зусім па-іншаму адносілася да А. С. Пушкіна перадавая беларуская інтэлігенцыя, для якой, па трапнаму выразу Янкі Купалы, А. С. Пушкін быў асабліва блізкі і дарагі "за тое, што ён — жывы барацьбіт за свабоду, за шчасце чалавецтва", "пісаў шчыра-бунтарскі, не баючыся за свае жыццё" [17].

*1997*

---

[16] НА РБ. Ф. 300, воп. 1, спр. 79, арк. 39.

[17] Купала Я . Зб. тв.: У 7 т. Мн., 1976. Т. 7. С. 276–277.

*Рыгор Шырма*

# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ А. С. ПУШКІНА

Сто гадоў мінула з тае пары, як памёр Пушкін. У гэтыя дні векавога юбілею не лішнім будзе ўспомніць пра паэта, пра тое, як ён тварыў, змагаўся, гарэў і нарэшце трагічна загінуў у росквіце сваіх творчых сіл.

Радзіўся Пушкін у Маскве 26 мая 1799 года ў знатнай, але збяднелай дваранскай сям'і. У дзіцячых гадах Пушкін не выяўляў нічога надзвычайнага: быў непаваротлівы, спакойны хлопчык, якога бацькі не любілі за тое, што ён не падобны быў да іншых дзяцей. Матка часта гневалася на яго, ён хаваўся ў свае бабкі М. А. Ганібал у кошык для ручной працы, дзе ўжо ніхто не смеў зачапіць яго. Бабуля і нянька Арына Радзівонаўна былі першымі настаўнікамі паэта. Толькі з імі паэт і мог гутарыць па-расейску, бо ў бацькавым доме панавала выключна французская мова.

На сёмым годзе жыцця Пушкін змяніўся да непазнання: ён стаў свавольным і вясёлым. Вучыўся дрэнна, бо ў тых вучыцеляў, што наймаў бацька, нельга было вучыцца добра: гэта былі пераважна неадукаваныя французы, якія любілі нічога не рабіць, жыць коштам чужым, гэта былі такія вучыцелі, якіх расійскія дваране бралі да сваіх дзяцей "числом поболее, ценою подешевле". Першыя вершы Пушкіна былі напісаны па-французску.

Летам Пушкін ездзіў на вёску, дзе бачыў, як спраўляліся народныя святы, вадзіліся карагоды. Да няньчыных казак далучыліся народныя песні і гульні — натуральная жывая сялянская паэзія.

19 кастрычніка 1811 года Пушкін паступае ў Царскасельскі ліцэй; з лёгкім сэрцам і нават з радасцю пакінуў бацькоўскі дом. Першы верш паэта па-расейску быў напісаны ў ліцэі. Тут прабудзіўся геній Пушкіна, і, трэба сказаць, прабудзіўся рана. Ад 1814 года яго творы ўжо з'яўляюцца ў друку. Будучы ў ліцэі, Пушкін напісаў 120 вершаў і пачаў паэму "Руслан і Людміла". У 1815 годзе на публічных экзаменах Пушкін зачараваў усіх сваімі вершамі.

Пасля ліцэя яго прызначылі чыноўнікам у Калегію замежных спраў. Аднак ён не цікавіцца зусім кар'ерай урадоўца, а далей працуе над паэзіяй, канчае "Руслана і Людмілу", спачувае вольным ідэям, выказвае гэтае спачуванне не толькі ў гутарках, але і ў вершах, якія хутка расходзяцца сярод моладзі.

Оды Пушкіна і эпіграмы на ўсемагутнага Аракчэева ўважаліся палітычным злачынствам. Пушкіну пагражала высылка ў Сібір ці на Салаўкі. За яго заступіліся важныя ўплывовыя асобы, і замест Сібіры ён быў высланы на поўдзень. Там ён піша паэмы “Бахчысарайскі фантан”, “Каўказскі нявольнік”, “Цыганы”, пачынае “Яўгенія Анегіна”. Генералы, якім быў падпарадкаваны Пушкін, бачаць не Пушкіна-паэта, а Пушкіна-ўрадоўца, “коллежского секретаря” і стараюцца яго прынізіць. Пушкін плоціць ім насмешкамі і эпіграмамі. За эпіграму на Варанцова яго высылаюць другі раз у сяло Міхайлаўскае. Наглядаць за паэтам даручылі мясцоваму начальству, архімандрыту манастыра і роднаму бацьку. Бацька вельмі ахвотна прыняў на сябе ролю даносчыка на свайго “блуднага сына”. Цяжкія сцэны былі паміж імі; адну з гэтых сцэн Пушкін выкарыстаў для свайго “Скупога рыцара”. Вось тут, калі Пушкіну дадзена апека ўсялякіх жандараў, ён у роспачы кідае фразу: “Дагадаў мяне чорт урадзіціся ў Расеі з душою і талентам!”

У Міхайлаўскім Пушкін чытае, вучыцца, мае супольнасць з народам, збірае народную творчасць, здабывае ўсё неабходнае для свайго развіцця. Ён просіць кніг. Яго старыя прыяцелі прысылаюць кнігі. І чаго толькі тут няма. Біблія, Каран, Вальтэр Скот, Шэкспір, “Запіскі Фушэ”, Карамзін і шмат-шмат іншыя. Усё чытаецца, аб усім робяцца нататкі. Прыгонная нянька Арына Радзівонаўна не толькі адчыніла яму скарбы душы расейскага народа сваімі казкамі і песнямі, але, больш таго, заступіла для яго родную матку. І любіў жа Пушкін сваю няньку!.. Называў яе заўсёды мамаю.

Усё глыбей уваходзіць паэт у народную стыхію, вывучае народную мову, пераапранаецца мешчанінам, ходзіць на кірмашы; прыйдзе ў народ, там гульні, а ён сядзе на зямлю, сабярэ жабракоў ды сляпых, яны яму песні пяюць, вершы сказваюць. Маладосць з яе байранаўскімі парывамі адыходзіць удаль. Іх месца займае спакойная ўсебаковая ўдумлівасць, мудрае зразуменне шэрай, сумнай, нязносна цяжкай расейскай рэчаіснасці, аб якой паэт з болем у сэрцы пісаў яшчэ ў 1819 годзе, калі першы раз прыехаў у сяло Міхайлаўскае:

Но мысль ужасная здесь душу омрачает:
        Среди цветущих нив и гор
Друг человечества печально замечает
Везде Невежества губительный Позор.
        Не видя слез, не внемля стона,
На пагубу людей, избранное Судьбой,
Здесь Барство дикое, без чувства, без Закона,
Присвоило себе насильственной лозой
И труд, и собственность, и время земледельца.
Склонясь на чуждый плуг, покорствуя бичам,
Здесь Рабство тощее влачится по браздам
        Неумолимого Владельца.

Здесь тягостный ярем до гроба все влекут,
Надежд и склонностей в душе питать не смея,
Здесь девы юные цветут
Для прихоти бесчувственной злодея.
Опора милая стареющих отцов,
Младые сыновья, товарищи трудов,
Из хижины родной идут собой умножить
Дворовые толпы измученных рабов.

І сапраўды, памешчыкі часоў Пушкіна былі самыя дзікія. Адзін з буйнейшых пскоўскіх памешчыкаў А. Львоў закатоўваў сваіх сялян да смерці. Калі прыгонная дзяўчына адмовілася стаць яго каханкай, то за гэта была зацкавана сабакамі. Розгі, бізуны, жалезныя ланцугі, калодкі на ногі — былі звычайнымі сродкамі, каб змусіць селяніна да працы на памешчыка. Падаваць на памешчыка скаргі нельга было, забаронена законам. Падкупленая паліцыя скрывала ўсе жорсткія злачынствы "дзікого барства". Усіх, хто адважыўся б, як Пушкін, загаварыць аб гэтых дзікасцях, спатыкала б жорсткая кара. Нават за хаванне перапісаных вершаў Пушкіна, якія былі знойдзены ў аднаго кандыдата Маскоўскага універсітэта, Сенат выдаў прысуд: адабраць універсітэцкі дыплом, а самога кандыдата здаць у салдаты або выслаць на Сібір.

У Міхайлаўскім Пушкін напісаў драму "Барыс Гадуноў" і, прачытаўшы, сам біў сабе брава: "Ай ды Пушкін!" Ён ведае, што тагачасная Расея яшчэ не дарасла да яго, каб даць здаровую ацэнку тагачаснага твора. Шэсць гадоў ён не здаваў у друк "Барыса Гадунова", бо не меў даверу да густу публікі і крытыкаў. І не памыляўся. Крытыка жорстка распраўілася з "Барысам Гадуновым". Толькі адзін Бялінскі з яго светлым розумам прызнаў значэнне гэтага твора.

У 1825 годзе Пушкін перажывае разгром дзекабрыстаў. Напачатку сам хацеў ехаць у Пецярбург. Але што ж, калі дзекабрысты не прынялі яго ў свой круг? Можа, не хацелі на выпадак няўдачы паўстання рызыкаваць геніяльнай галавой Пушкіна?. . Паэт застаўся ў Міхайлаўскім...

Праз год, у 1826 годзе, Пушкіна з фельд'егерам даставілі да цара, які першым чынам запытаўся, ці далучыўся б ён да паўстання дзекабрыстаў, калі б быў тады ў Пецярбурзе. Пушкін адказаў, што абавязкова далучыўся б, бо там былі ўсе яго прыяцелі. Такі смелы адказ зрабіў уражанне на цара-дэспата, які на знак асаблівай міласці да паэта ўзяўся быць цэнзарам яго твораў і дазволіў яму жыць у Пецярбурзе.

Пачынаецца новы перыяд у жыцці Пушкіна. 18 лютага 1831 года ён узяў шлюб са свецкай красуняй Наталляй Ганчаровай. Для Пушкіна сям'я была зацішным куточкам, дзе ён мог спакойна працаваць, жонку вабіў "вышэйшы свет". Пушкін знаў цану "вышэйшаму свету", гэтай "агіднай, бруднай лужы", гэтай самай сапраўднай "чэрні", такой ненавіснай паэту. У гэты перыяд Пушкін напісаў свае казкі, закончыў "Ру-

салку”, “Капітанскую дачку”, “Дуброўскага”, прыгатаваў матэрыялы з “Гісторыі Пугачоўскага бунту”. У канцы 1833 года яго “пожаловали” камер-юнкерам і далі 20 000 рублёў на друкаванне “Гісторыі Пугачоўскага бунту”. Можна было падумаць, што жыццё паэта нарэшце наладзілася. Але ў сапраўднасці лёс паэта пасля 1834 года ідзе да трагічнай развязкі.

Пецярбургскае грамадства — так званы “вышэйшы свет” — не магло мець пашаны да вялікага паэта, бо гэта быў “неблагонадежный, поднадзорный” чалавек, ды яшчэ негрыцянскага паходжання. Не адчувалася гэтае пашаны і з боку сучаснай літаратуры. На чале яе стаіць Булгарын, выдавец “Северной пчелы”, якая поўнасцю была ў руках урада. Артыкулы для свайго часопіса Булгарын даставаў проста з ахранкі. Такая літаратура не прызнавала за Пушкіным ніякіх заслуг, ніякага таленту, “ни одной высокой мысли, ни одного возвышенного чувства, ни одной полезной истины”. Пушкіна абурала такая манаполія на літаратуру, ён прыступае да выдання свайго часопіса “Современник”.

“Северная пчела” на гэта стала даводзіць, што Пушкін як журналіст сябе панізіў: “стал рабом толпы”. І тут адчувалася рука ўсяўладнага шэфа жандараў Бенкендорфа.

Пушкін не хацеў быць у даўгу: выкрываў грахі Булгарына, сыпаў эпіграмы на міністра асветы і галоўнага цэнзара графа Уварава, заўсёды быў гатовы даць не толькі адпор, але і напад зрабіць на праціўніка. Міністр Увараў выгаварыў Пушкіну, нашто ён дазволіў сабе абсмяяць эпіграмамі “почтенных и заслуженных людей”. Пушкін ускіпеў і адказаў графу:

— Якое права маеце рабіць мне выгавор, калі не маеце пэўнасці, што гэта мае вершы?

— Але ўсе кажуць, што вашы, — запярэчыў Увараў.

— Мала што кажуць! А вось на вас я напішу вершы і надрукую за сваім подпісам.

Пасля гэтага Пушкін піша сатыру “На выздараўленне Лукула”. Сатыра — злосная насмешка з міністра Уварава, з яго няўдалых замыслаў захапіць багатую спадчыну захварэўшага сваяка. У выніку — новы выклік да Бенкендорфа, пра сустрэчу з якім расказвае сам Пушкін.

— Мушу давесці да вашага ведама, — кажа Бенкендорф, — прыкрую справу адносна гэтых вашых вершаў. Хоць вы і назвалі іх перакладам з латыні, аднак грамадства расейскае ўжо досыць асвечана, што ўмее чытаць паміж радкамі...

— З усім згаджаюся і радуюся за развіццё нашага грамадства. Але дазвольце запытаць, хто гэтая няшчасная асоба, якую вы пазналі ў маёй сатыры?

— Не я пазнаў, а граф Увараў пазнаў сябе і прасіў данесці цару. І нават, што вы збіраліся напісаць аб ім вершы.

— Сказаў, не адракаюся... Толькі гэтыя вершы не на яго пісаны.

— А на каго ж?

— На вас.

Бенкендорф вырачыў вочы, ускрыкнуў:

— Што? На мяне? — і, схапіўшы часопіс, пачаў тыкаць пальцам у пэўныя месцы вершаў са словам: — Паслухайце. Што ж гэта такое? Ну, няньчыў вяльможы, абманваў жонку — гэта глупства. Але вось казённыя дровы краў! Што вы на гэта скажаце?

— Скажу тое, што вы сябе не пазналі тут.

— Ды ці ж я краў казённыя дровы?

— То выходзіць, што Увараў краў, калі прыняў гэта на сябе.

Бенкендорф зразумеў Пушкіна і толькі прамармытаў:

— Гм! Так!.. Сам вінаваты.

Зразумела, што такая вайна не давала паэту супакою. Жыццё яго становіцца немагчымым, характар рэзка мяняецца. А гэтым усім карыстаецца той самы "вышэйшы свет", які заўважыў самую чулую рысу ў характары паэта — яго хваравіты страх за добрае імя жонкі, і на гэты страх была накіравана ўся ўвага тых аматараў скандалаў, пра каго пазней будзе пісаць Лермантаў: "Свабоды, гения и славы палачи".

Якраз знайшоўся адпаведны суб'ект — французскі эмігрант Жорж Дантэс, якога цар Мікалай прыняў на службу ў гвардыю. Пустое сэрца Дантэса болей адпавядала царскаму двару і "высокаму свету", як геній Пушкіна. Рука ўмыслова абмежаванага Дантэса была накіравана проці Пушкіна расейскімі прыдворнымі арыстакратамі. Сам цар пры гэтым згуляў ролю Пілата. Дантэс пачаў настойліва заляцацца да жонкі Пушкіна. Невядомыя асобы пачалі пісаць ананімы, прысылаць дыпломы Пушкіну на годнасць "гістарыёграфа ордэна раганосцаў". Паэт быў змушаны актыўна выступіць на абарону сваёй годнасці. Усё, што да гэтага часу таілася на дне гордай душы, захвалявалася і закіпела ў ім. У асобе Дантэса Пушкін кідае выклік усяму пецярбургскаму свету.

Ён ужо не меў маральнай сілы абысці лжывы свет пагардаю і прыняў апошнюю смяротную спрэчку з "глупцами жестокого века".

Адчуваючы, што для яго ўсё і назаўсёды скончана, ён напісаў яшчэ адзін верш — "Помнік", магутны і горды эпілог сваёй літаратурнай дзейнасці. Такой мовай мог гаварыць толькі геній.

27 студзеня 1837 года адбылася дуэль, на якой Пушкін быў цяжка паранены, а праз два дні, 29 студзеня 1837 года, перастаў жыць.

Цела Пушкіна адразу было аддадзена пад нагляд паліцыі; у царкву перанеслі ноччу, па вуліцах паставілі вайсковую сілу і ноччу пад эскортам жандараў адправілі ў Пскоўскую губерню і пахавалі ў Святагорскім манастыры. Смерць Пушкіна ўскалыхнула народнае сумленне, абудзіла грамадскую думку. Усе слаі пецярбургскага насельніцтва пайшлі

пакланіцца целу паэта. Моладзь хацела несці труну на руках да царквы. Да моладзі хацелі далучыцца многія паклоннікі Пушкіна. Але цар і жандары сталі паміж грамадствам і паэтам. Толькі на правінцыі гора і сум выяўляліся свабадней. У Казанскім універсітэце прафесар літаратуры ўзышоў на кафедру і, замест таго каб пачаць лекцыю, гучна сказаў: "Устаньце!" — падняў газету і ўзварушаным голасам прачытаў: "Сонца нашай паэзіі закацілася. Няма болей Пушкіна". Аўдыторыя ахнула ў адзін голас... Прафесар сеў і, схіліўшы на кафедру сівую, як серабро, галаву, заплакаў. Прайшло некалькі хвілін. Ён устаў і сказаў: "Князь расейскіх паэтаў не жыве. Яго цела вязуць далёка некуды з Пецярбурга. Пры адкрытай труне Пушкіна як гаварыць аб расейскай літаратуры?. . Пойдзем маліцца!"

Але найпрыгажэйшымі провадамі былі вершы Лермантава аб вечнай красе паэта і знішчальныя словы да тых патомкаў "известной подлостью прославленных отцов", якія забілі Пушкіна. Вершы разышліся ў дзесятках, тысячах рукапісных экземпляраў. Лермантаў пасля гэтага быў высланы. Гогаль таксама прынёс свой вянок на труну Пушкіна — сваю глыбокую жальбу. Ён да самай смерці ўспамінаў: "Пушкін! Які ж гэта прыгожы сон я бачыў у жыцці!"

Царская Расея паставіла Пушкіна на Галгофу і замучыла, народная Расея аплакала горкімі слязамі і ўваскрасіла як свайго генія.

*1937*

*Максім Танк*

# СВЕТАЧ РУСКАЙ ПАЭЗІІ

Загінуўшы ў самым росквіце творчага шляху, Аляксандр Сяргеевіч Пушкін заўсёды быў і застаецца старэйшым мудрацом для наступных пакаленняў паэтаў і пісьменнікаў, прадаўжальнікаў яго справы. Сярод іх мы называем перш за ўсё карыфеяў заснаванай ім вялікай літаратуры, не выключаючы Льва Талстога, Фёдара Дастаеўскага, Вісарыёна Бялінскага. Каму не вядомы вешчыя словы выдатнага даследчыка пушкінскай паэзіі: "Пушкін належыць да з'яў, якія жывуць і рухаюцца вечна, не спыняючыся ў тым пункце, дзе заспела іх смерць, а працягваючы развівацца ў свядомасці грамадства".

У нашы дні Пушкін застаецца тым, для чаго быў прызначаны гісторыяй. Ніводны з класікаў сусветнай літаратуры не займае такога месца ў сучасным духоўным жыцці свайго народа, як Пушкін. Час даўно вылучыў яго залаты скарб, які не так і лёгка пералічыць: гэта не толькі раман "Яўгеній Анегін", трагедыя "Барыс Гадуноў", паэма "Медны коннік", не толькі шэдэўры лірыкі кахання і філасофскай, "маленькія трагедыі", казкі, непаўторна яскравая проза, але і крытычныя артыкулы і нарысы.

"Высокая і светлая сіла яго паэзіі, чалавечнасць дум і пачуццяў, пушкінскі гуманізм, справядліва ўзяты цяпер за спадчыну гуманізмам сацыялістычным", як зазначаў Аляксандр Твардоўскі, не страцілі свайго значэння сёння і не страцяць ніколі. Пушкін пражыў кароткае, але вялікае жыццё і здолеў разабрацца ў ім з пераканаўчай глыбінёй. Шырыня пушкінскага кругагляду бязмежная. У яго творах, нататках і лістах шчодра параскіданы самабытныя, сціслыя меркаванні ледзь не пра ўсе важнейшыя з'явы гісторыі культуры чалавецтва з самых старажытных часоў і аж да 30-х гадоў XIX стагоддзя.

Як сын Айчыны, Пушкін не мог не задумвацца над кардынальным пытаннем усіх часоў і народаў — над вынікамі вялікіх узрушэнняў у грамадстве і прыродзе, над праблемамі вайны і міру. Ён быў патрыётам, ганарыўся перамогамі войска расійскага, але адначасова бачыў усю жорсткасць вайны, незваротныя страты. У вершы "Вайна" Пушкін пісаў:

И все умрет со мной: надежды юных дней,
Священный сердца жар, к высокому стремленье,
Воспоминание и брата и друзей,

И мыслей творческих напрасное волненье,
И ты, и ты, любовь?..

Пісалася ўсё гэта не ў нашу пару, калі над галавой вісіць небяспека знішчэння чалавецтва. Аднак яго неўміручыя словы гучаць як набатны кліч, звернуты да ўсіх народаў свету: “Да здравствует разум, да скроется тьма!” Пушкін першы ўсвядоміў тыя праблемы, якія хвалявалі пісьменнікаў Расіі XIX стагоддзя. Яго нястомнымі клопатамі была створана руская літаратурная мова, ва ўсіх жанрах здзейснены радыкальныя рэформы. Даўшы магутны штуршок новай рускай літаратуры, ён імкліва вывеў яе на сусветную дарогу, паставіўшы надзейныя і далёка бачныя вехі для ўпэўненага руху наперад. Дарэчы будзе прывесці нядаўняе выказванне амерыканскага пушкініста Уолтэра Вікеры: “Пушкін сказаў тое, што ніколі не было да яго вымаўлена, і тое, што з тых часоў ніколі не забывалася”.

Універсальнасць яго мастацкага генія дазволіла стварыць найвышэйшыя вобразы не толькі рускага верша, але і прозы. Нездарма ж Леў Талстой сцвярджаў, што “Аповесці Белкіна” трэба “вывучаць і вывучаць кожнаму з пісьменнікаў”. Свой стыль Пушкін сфармуляваў так: “Дакладнасць і сціслацсць — вось першыя вартасці прозы. Яна патрабуе думак і думак — без іх бліскучыя выразы нічому не служаць...”

Пушкін — адна з самых дзіўных з’яў у сусветнай паэзіі, і як пясняр братняга рускага народа нам ён заўсёды быў асабліва блізкім. Пад яго дабратворным уплывам расла і развівалася беларуская паэзія. Бадай, нельга сёння знайсці ў нас паэта, у творчасці якога не адчуваўся б яго ўплыў. Не знойдзеш і ніводнага беларуса, які б не чытаў Пушкіна ў арыгінале ці па-беларуску.

Пачынаючы ад нашых старэйшых народных паэтаў Купалы і Коласа, амаль усе беларускія пісьменнікі перакладалі і перакладаюць Пушкіна. Лепшы пераклад паэмы “Медны коннік” на беларускую мову зрабіў Янка Купала, паэму “Палтава” пераклаў Якуб Колас, раман у вершах “Яўгеній Анегін” — Аркадзь Куляшоў, прозу Пушкіна, яго “Аповесці Белкіна” беларускі чытач ведае па перакладах Кузьмы Чорнага, трагедыю “Барыс Гадуноў” — па перакладу Пятра Глебкі.

Гэта былі не проста пераклады. Перакладаючы Пушкіна, беларускія мастакі слова трымалі экзамен на творчую сталасць і, магчыма, нават больш — на сталасць літаратуры, сведчачы яе няспынны рост.

З Беларуссю звязаны і пэўныя моманты біяграфіі Пушкіна. Праз наш край пралёг шлях маладога паэта, які вяртаўся з выгнання ў Міхайлаўскае праз Магілёў і Віцебск. У Беларусі жылі нашчадкі Пушкіна. Сюжэт аповесці “Дуброўскі” быў падказаны гісторыяй “аднаго небагатага беларускага шляхціца па прозвішчу Астроўскі”.

Прайшло паўтара стагоддзя з дня смерці Пушкіна, а мы яго ўсё адкрываем нанова, бо яго творчая спадчына — жывая і дзейсная сіла, магутны паскаральнік развіцця шматнацыянальнай сацыялістычнай культуры.

Адной з надзённых задач кожнага, хто працуе на ідэалагічным фронце нашага грамадства, павінен быць клопат аб набліжэнні Пушкіна да нашых дзён, да цяперашніх і заўтрашніх пакаленняў савецкіх людзей. Тут вялікая роля адводзіцца школе, якая, ступіўшы на дарогу рэформы, здольна будзе далучыць свядомасць навучэнцаў да невычэрпна багатых духоўных скарбаў народа, і перш за ўсё да пушкінскага набытку. Вялікія творы генія маюць у мастацтве бясконца доўгае жыццё на карысць чалавецтва.

Мала прыйсці да Пушкіна, трэба рабіць усё магчымае, каб Пушкін, які кліча да новай гармоніі, вучыць быць маладым, не пакідаў нас. Таму дзень гібелі Пушкіна мы і адзначаем як сведчанне яго неўміручасці.

*1987*

*Іван Навуменка*

## БЕССМЯРОТНЫ ГЕНІЙ РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Сто пяцьдзесят гадоў прайшло пасля смерці Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна, генія рускай літаратуры, які сваёй асобай і сваёй творчасцю аказаў і аказвае вялікі ўплыў на лёсы літаратур народаў Савецкага Саюза, на сусветны літаратурны працэс.

Жыццёвы шлях Пушкіна быў нядоўгі і невымерна трагічны. Пачаўшыся на сумежжы XVIII і XIX стагоддзяў, ён абарваўся на самым парозе дэмакратычнага ўздыму рускай літаратуры, якая як бы прыняла эстафету ад ідэй дзекабрыстаў.

Пушкін належыць да ліку прызнаных геніяў. Ён быў прызнаны адразу, у дні яго жыцця вакол кожнага твора паэта вяліся гарачыя спрэчкі, дыскусіі, і кожнае новае дзесяцігоддзе, кожная эпоха па-свойму адкрывала Пушкіна, выяўляючы сваё адчуванне, бачанне спадчыны геніяльнага паэта. Мы, сацыялістычныя нашчадкі паэта, аддзеленыя ад папярэдніх эпох сямідзесяцігадовым рубяжом Вялікага Кастрычніка, бачым у Пушкіне не толькі надзвычайнай сілы асобу, паэта-волата, творы якога хвалююць і ўзвышаюць сэрца, не толькі стваральніка рускай літаратурнай мовы, на якой узнікла і руская савецкая класіка, мы бачым у Пушкіне сучасніка, субяседніка, настаўніка, які дапамагае жыць, працаваць і без якога наогул нельга ўявіць наша літаратурнае, мастацкае, духоўнае жыццё.

У нашай сацыялістычнай краіне паэзія Пушкіна атрымала такое шырокае распаўсюджанне, перад якім не ідуць ні ў якое параўнанне выданні паэта ў дарэвалюцыйную пару. Дастаткова сказаць, што апошні трохтомны Збор твораў паэта выходзіць тыражом 10 мільёнаў 700 тысяч экземпляраў. Можна ўпэўнена сцвярджаць: творы Пушкіна як настольная кніга ёсць у кожным савецкім доме.

Воляй лёсу Пушкін пазбег віселькі, катаргі, што чакалі дзекабрыстаў — блізкіх сяброў і аднадумцаў паэта. Але паэтычная дзейнасць Пушкіна, што вялася у няспыннай, жорсткай, няроўнай барацьбе з сіламі рэакцыі, цемрашальства за духоўную незалежнасць сваёй асобы, права заставацца “непадкупным” голасам і “рэхам рускага народа”, была не меншым грамадзянскім подзвігам, чым рэвалюцыйны подзвіг дзекабрыстаў. Адчайныя намаганні думаць і пісаць, як ён хоча, не прыніжацца перад царом і царадворцамі ў рэшце рэшт паставілі геніяльнага паэта пад няўмольны пісталет Дантэса.

Пушкін — першы рускі паэт сусветнага маштабу і значэння. Свой уплыў на мастацкае развіццё чалавецтва ён аказваў перш за ўсё тым, што быў найвялікшым паэтам Расіі і яго творчасць як бы апладніла, дала напрамак найвыдатнейшым ідэйна-мастацкім адкрыццям і здабыткам наступных перыядаў рускай літаратуры, рускай духоўнай культуры, што атрымалі магутны міжнародны рэзананс, сусветнае прызнанне ўжо ў пасляпушкінскую эпоху.

Творчасць Пушкіна ўвабрала ў сябе вялікі гістарычны, мастацкі вопыт усёй папярэдняй рускай літаратуры. Пушкінская паэзія разгарнула крылле на хвалі ўздыму рускай нацыянальнай самасвядомасці, выкліканай Айчыннай вайной 1812 года. Магчыма, па гэтай прычыне Пушкін быў, па сутнасці, паэтам адной тэмы. Але тэма гэта — Расія, яе мінулае, сучаснасць, будучыня, яе дзіўная, непаўторная прырода, адметнасць, своеасаблівасць рускага нацыянальнага характару, нарэшце, месца Расіі ў свеце.

Вядома, папярэднікі Пушкіна, пачынаючы, бадай, ад летапісца Нестара, таксама пісалі аб Расіі. Тым часам Пушкін першы стаў геніяльным нацыянальным паэтам рускага народа, бо першы загаварыў яго мовай, зірнуў на свет яго вачамі, увасобіў у сваіх творах этычны і эстэтычны народны ідэал. Пушкін прынёс у паэзію, прозу новы стыль — лірычны, эпічны, апавядальны, якога да яго руская літаратура не ведала і без якога яна не магла развівацца.

Пушкін быў не толькі геніяльным мастаком слова, ён быў адначасова філосафам, гісторыкам, выдатным крытыкам, літаратуразнаўцам, надзеленым здольнасцю паглыбляцца ў сівую мінуўшчыну і глядзець далёка наперад. Асоба Пушкіна настолькі багатая, шырокая, шматгранная, шчодра надзеленая ад прыроды, што не паддаецца колькі-небудзь выразнаму чалавечаму і мастацкаму вымярэнню. Пушкін неабдымны, як само жыццё. Незвычайная гарманічнасць, багацце, шматграннасць асобы і паэзіі Пушкіна далі падставу яго сучасніку Мікалаю Васільевічу Гогалю сказаць: “Пушкін ёсць з’ява надзвычайная і, магчыма, адзіная з’ява рускага духу: гэта рускі чалавек у яго развіцці, у якім ён, магчыма, з’явіцца праз дзвесце гадоў”.

Муза Пушкіна здольна плакаць і смяяцца, быць бесклапотна-гуллівай і ўздымацца на высокі парог трагічнасці, яна часам ператвараецца ў пранікнёны шэпт закаханага, споведзь уражанага жаночай прыгажосцю сэрца, умее спяваць дзіўную песню аб харастве прыроды і гаварыць трыбунным голасам народнага веча.

Пры ўсім гэтым Пушкін непадробна народны. Ён адчувае шчыра, ярка і моцна, мысліць імкліва, метка, незвычайна рэальна, прычым усе рухі, нюансы яго генія падпарадкаваны закону меры, гармоніі, якую паэт адчувае дасканала.

У вершах палітычнай лірыкі Пушкіна, такіх, як “Вольнасць”, “Да Чаадаева”, “Вёска”, канкрэтныя, праграмныя ідэі дзекабрыстаў набы-

ваюць сапраўды лірычнае, паэтычнае гучанне. Рамантычная па сіле эмацыянальнай экспрэсіі лірычная танальнасць гэтых і многіх іншых вершаў спалучаецца з прадметнай дакладнасцю, гарманічнасцю, якіх так не хапала рускай грамадзянскай паэзіі.

Пачынаючы з дзяцінства, са школьных хрэстаматый, адкрываць харастве навакольнага свету, роднай зямлі больш чым хто іншы з паэтаў нас вучыць Пушкін. "Буря мглою небо кроет, вихри снежные крутя, то, как зверь, она завоет, то заплачет, как дитя"; "Уж небо осенью дышало, уж реже солнышко блистало, короче становился день, лесов таинственная сень с печальным шумом обнажалась"; "Зима!.. Крестьянин, торжествуя, на дровнях обновляет путь, его лошадка, снег почуя, плетется рысью как-нибудь" — колькі такіх радкоў і вершаў запомнілі мы з дзяцінства, і яны сталі нашымі спадарожнікамі на ўсё жыццё. Пачуццё радасці, здзіўлення, захаплення выклікаецца якраз тым, што ў вершах геніяльнага паэта ўсё вельмі простае, роднае, блізкае.

Так, Пушкін вучыць нас аптымістычна, радасна, з даверам да свету і да чалавека глядзець на жыццё, і без гэтых яго запаветных урокаў проста нельга ўявіць сабе далейшае развіццё нашай літаратуры і культуры.

У лірыцы Пушкіна знайшлі найбольш поўнае выяўленне асоба паэта, небывалая духоўная энергія, адчуванне вялікім творцам як супярэчнасцей жыцця, так і яго гармоніі. Пушкіну бясконца дарагія свет рускага нацыянальнага і народнага жыцця, духоўныя каштоўнасці, створаныя народам на працягу стагоддзяў. Сваёй першай паэмай "Руслан і Людміла", бессмяротнымі казкамі, усёй творчасцю геніяльны паэт гэта засведчыў.

На недасягальную вышыню ўзнялася пушкінская любоўная лірыка. Пушкін адкрыў такія глыбіні чалавечай душы, такія далечы палёту чалавечага духу, якіх да яго не ведала руская літаратура.

У першы перыяд сваёй творчасці (рубеж канца 10-х – пачатку 20-х гадоў XIX ст.) Пушкін узначальвае плынь рускага рамантызму, становіцца выразнікам яго вызваленчых, як і ў славутага англійскага паэта Байрана, імкненняў. Аднак ужо ў час стварэння сваіх так званых паўднёвых паэм — "Каўказскі палоннік", "Браты-разбойнікі", "Бахчысарайскі фантан", "Цыганы" — усёабдымная шырыня, жыццёвыя вытокі народнасці ў разуменні Пушкіна далёка апярэджваюць "байранічнае" разуменне гэтага прынцыпу. Таму першаступеннай рысай "народнасці" ў Пушкіна выступае неабходнасць ачысціць літаратурную мову ад залішняй вытанчанасці, "вычурнасці", перанятай некаторымі рускімі пісьменнікамі ад пісьменнікаў заходнееўрапейскіх і неўласцівай рускаму стылю, светаўспрыманню, светаадчуванню.

"Яўгеній Анегін" — найвышэйшае паэтычнае дасягненне Пушкіна, якое не мае жанравых аналогій ні ў рускай, ні ў сусветнай літаратуры.

Бялінскі назваў вершаваны раман Пушкіна "энцыклапедыяй рускага жыцця". У рамане паэт крытычна асэнсоўвае адрыў адукаваных вярхоў дваранскага грамадства, яго самаізаляцыю ад жыватворнага маральнадухоўнага грунту, традыцый нацыянальнага жыцця, у тым ліку традыцый простанародных, сялянскіх.

Вершаваны раман "Яўгеній Анегін", трагедыя "Барыс Гадуноў", паэмы "Палтава", "Медны коннік", празаічныя творы — "Аповесці Белкіна", "Капітанская дачка", "Дуброўскі" кладуць пачатак рэалістычнай плыні рускай літаратуры. Параднай, святочнай Расіі ў шэрагу празаічных твораў Пушкіна, такіх, як "Аповесці Белкіна", "Дуброўскі", "Гісторыя сяла Гарухіна", супрацьстаіць вясковая Расія, Расія селяніна і памешчыка, яе жахлівая беднасць, бяспраўе, бескультурнасць. Гэтыя творы нібы пракладваюць шлях "Мёртвым душам" Гогаля, паэзіі Някрасава. Разам з тым "Гісторыя сяла Гарухіна", як і "Капітанская дачка", "Дуброўскі", "Гісторыя Пугачова", у якіх паказваюцца сялянскі бунт і яго правадыры, намячаюць прыкметную тэму пушкінскай творчасці — праблему рэвалюцыі.

З'яўляючыся па сваёй прыродзе арганічна рускай з'явай, Пушкін тым не менш умеў паглыбіцца ў духоўны свет іншых народаў, нацый, адчуць, зразумець яго, робячы і ў гэтай галіне вялікія адкрыцці. Эгаістычны пачатак, індывідуалістычная стыхія заходнееўрапейскай цывілізацыі з яе феадальнымі вытокамі, буржуазнай прыродай знайшлі ўвасабленне ў "маленькіх трагедыях" "Скупы рыцар", "Каменны госць", "Моцарт і Сальеры".

Надзіва аб'ектыўны, праўдзівы Пушкін: ён не кідае цень на чужаземнае жыццё, паказваючы яго ў драматычным сплячэнні светлых і цёмных бакоў. Пушкін ніколі не забывае пра агульначалавечыя якасці, пачуцці, страсці, якія не прыніжаюць і не ўзвышаюць адзін народ над другім.

Геніяльны паэт адчувае ўсе праявы, магчымасці чалавечага духу. У Пушкіна мы знаходзім галерэю тыпаў, характараў, уласцівых, бадай, кожнаму народу, бо ў шырокім шматнацыянальным свеце былі і ёсць свае Дон-Жуаны, геніяльныя даверлівыя Моцарты і бяздарныя, зайздросныя, здольныя нават на злачынства Сальеры.

Пушкін блізкі і родны нам, беларусам. Ён праязджаў па беларускіх вёсках і гарадах, цікавіўся гісторыяй Беларусі, і гэта дало яму падставу сказаць пра беларусаў як пра "народ, издревле нам родной, но отчужденный от России жребиями войны".

Пушкін самы любімы у нашым народзе пісьменнік. Мілагучна, чароўна гучыць Пушкін на беларускай мове, у тым ліку "Яўгеній Анегін", перакладзены А. Куляшовым, "Медны коннік" у перакладзе Янкі Купалы, "Палтава", перакладзеная Якубам Коласам, і многія іншыя пушкінскія творы — вершаваныя і празаічныя.

Вялікі ўплыў аказала творчасць Пушкіна на беларускую літаратуру. Яшчэ ў мінулым стагоддзі гэты ўплыў адчуў на сабе наш першы буйны мастак слова В. Дунін-Марцінкевіч. Маецца на ўвазе яго ідылія “Сялянка”, якая відавочна перагукваецца з пушкінскай “Паненкай-сялянкай”. У полі прыцягнення пушкінскай паэзіі мы бачым выдатнага беларускага дарэвалюцыйнага паэта Максіма Багдановіча. Класікі нашай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас глыбока зачарпнулі з бяздоннай крыніцы пушкінскай паэзіі. Якуб Колас уплыў пушкінскай творчасці на сябе называе рашаючым: “Калі б не было Пушкіна з яго “Яўгеніем Анегіным”, одай “Вольнасць” і “Пасланнем у Сібір”, “Капітанскай дачкой” і казкамі, — пісаў Якуб Колас, — не было б, напэўна, і маіх паэм “Новая зямля” і “Рыбакова хата”, лірыкі і прозы”.

Над гэтым прызнаннем Якуба Коласа варта задумацца. Відаць, выдатныя з’явы розных літаратур, заснаваныя на прынцыпе народнасці, народнай этыкі, эстэтыкі, сваімі духоўнымі вяршынямі сыходзяцца.

“У гісторыі развіцця літаратуры еўрапейскай, — пісаў Максім Горкі, — наша юная літаратура ўяўляе сабой феномен дзівосны... Наша літаратура — наша гордасць, лепшае, што створана намі як нацыяй. У ёй уся наша філасофія, у ёй увасоблены вялікія парыванні духу; у гэтым дзіўным, казачным, хутка пабудаваным хораме па сённяшні дзень ярка гараць розумы вялікай і красы, і сілы, сэрцы святой чысціні, розумы і сэрцы сапраўдных мастакоў... І ўсе яны, праўдзіва і сумленна асвятляючы зразуметае, перажытае імі, гавораць: хорам рускага мастацтва пабудаваны намі пры маўклівай дапамозе народа, народ натхняў нас, любіце яго...”

Першая зорка ў выдатным сузор’і рускай літаратуры — Аляксандр Сяргеевіч Пушкін. Як і прадбачыў паэт, ён не памёр для народа, яго душа, увасобленая ў запаветнай ліры, тлення пазбегла, яго назвала кожная існуючая на прасторах нашай неабсяжнай сацыялістычнай Айчыны мова: і горды ўнук славян, і тунгус, і калмык, як і ўсе астатнія савецкія народы. Слава геніяльнага паэта вядома далёка за межамі нашай Айчыны. Пушкінская паэзія натхняе, саграває сэрцы мільёнаў людзей ва ўсім свеце, служыць справе міру, згоды паміж народамі.

*1987*

*Васіль Быкаў*

# ВЫСТУПЛЕННЕ НА СХОДЗЕ, ПРЫСВЕЧАНЫМ 150-м УГОДКАМ З ДНЯ СМЕРЦІ А. ПУШКІНА

Пушкін — адна з вяршынь сусветнай культуры, нязгасны светач духоўнасці — пражыў недаўгое, складанае жыццё, надзвычай багатае ўрокамі для людзей і для чалавецтва ў цэлым.

Ён належаў ды тых волатаў духу, якіх у свой час або шчыра любілі, або гэтак жа шчыра ненавідзелі. У адносінах да яго размежаванне было гранічнае: або — або.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што гэтаксама адносіўся да свету, у якім жыў, і сам Пушкін. Адных ён усім сэрцам любіў (сяброў па ліцэю, некаторых разумных дам і немітуслівых літаратараў, проста шчырых, адкрытых людзей), другіх ненавідзеў (пустых царадворцаў, безгаловых чыноўнікаў, цэнзараў, традыцыйна ўсемагутную ў Расіі тайную паліцыю).

Вядома таксама, што Пушкін недалюбліваў сентыментальныя раманы і высокамоўныя гістарычныя сачыненні. “Ни наших университетов, ни наших театров Пушкин не любил”, — сведчыць адзін з яго блізкіх сяброў Павел Воінавіч Нашчокін. Дзіўна, але чалавек высокай культуры, майстра слова, ён не так ужо шанаваў прозу. Ёсць яго асабістае сведчанне, якое ў перадачы ягонай сяброўкі Аляксандры Андрэеўны Фукс гучыць так: “Как жалки те поэты, которые начинают писать прозою; признаюсь, ежели бы я не был вынужден обстоятельствами, я бы для прозы не обмакнул пера в чернила”. Калі гэта сапраўды так, дык чалавецтва ўдзячна тым яго “обстоятельствам”, якія так ці інакш былі ім перажыты; мы нават удзячны тым невясёлым абставінам, якія затрымалі паэта на некалькі тыдняў у далёкім Болдзіне і тым садзейнічалі нараджэнню бессмяротных радкоў ягонай прозы — маленькіх аповесцяў і маленькіх трагедый. Цяпер ужо няважна, як да гэтага ставіўся сам аўтар, які, дарэчы, схаваўся тады за прыдуманым іменем Івана Пятровіча Белкіна і нават сачыніў яго псеўдабіяграфію, няважна, што некаторыя з сяброў сустрэлі паяўленне ягонай прозы ў друку без асаблівай радасці, нават малаважна і тое, што разумны і праніклівы Бялінскі назваў іх нявартымі ні таленту, ні імені Пушкіна. Час паказаў, што Пушкін стварыў шэдэўры, значэнне якіх ніколі не зменшыцца.

Пушкін з’явіўся вялікім рэфарматарам літаратуры, усіх яе жанраў. Ён пераўтварыў тагачасную літаратурную мову, паэзію і, канешне ж, не мог абысці сваім наватарствам прозу.

Вядома, што проза — гэта перш за ўсё мова ў яе жывой натуральнасці, не перасаджаная з французскай ці якой-небудзь іншай, не штучны сурагат, а народная і жывая, якой тады не шмат было ў пецярбургскіх салонах, — затое ёю поўнілася народная стыхія, расійская глыбінка. Пушкін быў першы з расійскіх літаратараў, хто не пабаяўся шырока пусціць яе, занядбаную і пагарджаную, у расійскую славеснасць, у сваю паэзію, а затым і ў прозу — ад "Арапа Пятра Вялікага" да несумненнага пушкінскага шэдэўра, знакамітай "Капітанскай дачкі". Ён жа затым і сфармуляваў яе славутае неўміручае крэда: "Точность и краткость — вот первые достоинства прозы. Она требует мыслей и мыслей — без них блестящие выражения ни к чему не служат".

Урокі Пушкіна-празаіка так ці інакш адбіліся на творчасці геніяў сусветнай літаратуры, але найперш рускай. Лермантаў, Гогаль, Талстой, Чэхаў, Бунін тварылі пад несумненным уплывам Пушкіна. Ягонага ўплыву ў гэтым сэнсе не абмінуў ніводзін з сур'ёзных беларускіх пісьменнікаў, асабліва ў ранейшыя дзесяцігоддзі. (Гэта цяпер мы распісаліся, і не столькі думак у нашай прозе, колькі слоў. І тамоў.)

Але Пушкін вялікі не толькі паэтычнымі ці празаічнымі ўрокамі. Усё ягонае жыццё — змястоўнейшы ўрок этыкі, годнасці і маралі. Нават ягоныя чалавечыя слабасці — урок для многіх пакаленняў пісьменнікаў, дзеячаў культуры.

Ён быў волатам духу і заставаўся звычайным чалавекам свайго складанага часу. Ён не любіў царскі двор, але не меў сілы адмовіцца ад пакутніцкага жыцця пры ім. Вядома, што за якіх два гады да сваёй гібелі ён падаў прашэнне аб адстаўцы і нават атрымаў дазвол ад цара, ды забраў тое прашэнне назад. І мы цяпер думаем, як бы, мусіць, інакш склаўся ягоны лёс, калі б ён выйшаў у адстаўку, паехаў з сям'ёй у сваё Міхайлаўскае... Але не, умяшаліся сябры і з іх самы лепшы — Жукоўскі. Як гэта нярэдка бывае — з самых лепшых пачуццяў і найлепшых жаданняў. Але тое ўмяшанне павяло паэта прамой дарожкай да гібелі.

Вядома, што жыццё і гісторыя багаты на крутыя павароты і нечаканасці, далёка не ўсё ў іх можна прадугледзець нават у наш камп'ютэрызаваны век. Часам не ўсё разумеў і Пушкін. Як сведчаць сучаснікі, ледзь не да апошніх гадоў жыцця ён як бы саромеўся звання літаратара, "сачыніцеля", як тады гаварылі. Ён хацеў быць патомным расійскім дваранінам, належаць да знаці. Ён невысока ставіў Акадэмію славеснасці, да членаў якой належаў, і дбаў пра членства ў Акадэміі навук, куды яго ўпарта не пушчаў сам міністр асветы граф Увараў. Шмат год не хацеў верыць Пушкін у сваю вялікую нацыянальную місію, якая зрабіла бессмяротным яго імя. Але ж хіба адзін Пушкін? І хіба тое здаралася толькі ў часы Пушкіна? Поезд справядлівасці, як даўно вядома, нярэдка спазняецца, і "нету пророка в отечестве своем". У поўным

сэнсе вялікім пракрокам Пушкін стаў пасля смерці, затое ён будзе такім заўжды. Даўно сцерліся з людской памяці імёны цароў і царадворцаў, розных “сильных мира” пачатку XIX стагоддзя, усіх тых, перад кім пачціва цягнуўся Пушкін. А Пушкін жыве. І ён будзе жыць, пакуль будзе існаваць чалавецтва, бо ягоная вялікая, жывая душа ў наш не толькі жорсткі, але і жудасны век з’ядноўвае людзей пачуццямі дабра, злучае разарваную сувязь часоў і дае надзею.

Надзею выжыць, не ператварыцца ў атамных дзікуноў, не толькі выхаваць сучасны высокарацыянальны розум, але і не занядбаць душу, здольную на дабрыню, чалавечнасць, а часам — і слабасць. Калі-нікалі так бывае ў гісторыі, што апроч сілы патрэбна і слабасць, бо слабасці патрэбна справядлівасць. Сіле ж нічога не трэба.

І гэта выдатна разумеў Пушкін.

Няхай жа навек ён застанецца на зямлі пракрокам дабра і справядлівасці.

*1987*

*Валерий Черепица*

# "ДАЙ НАМ РУКУ В НЕПОГОДУ..."

160 лет тому назад остановилось сердце А. С. Пушкина. Пройдет еще два года, и 6 июня 1999 года исполнится 200 лет со дня рождения великого поэта и гражданина.

Пушкин всегда современен. Он волнует нас сегодня не меньше, а может быть, и больше, чем волновал наших предков много лет назад. В обстановке напряженных духовных исканий, затянувшегося социально-экономического и политического кризиса, межнациональной напряженности и падения нравственных устоев Пушкина нам очень недостает. А потому не менее актуально, чем прежде, звучат обращенные к поэту слова Александра Блока: "Пушкин! Тайную свободу пели мы вослед тебе. Дай нам руку в непогоду, помоги в немой борьбе".

Сегодня нам особенно дорого и важно пристальное внимание Пушкина не только к русской культуре, но и к жизни разноплеменной России. Поэт помогает нам глубже осознать, что русская культура от своих истоков до сегодняшнего дня представляет глубоко самобытный цивилизованный комплекс, в котором общемировые универсалии сложились в неповторимое сочетание, обусловив тем самым действительно уникальный многонациональный комплекс российской культуры, представляющий "синтез на основе самобытности".

В живую ткань этой ярчайшей из славянских культур вплетены и белорусские нити. Язык произведений Пушкина, русский литературный язык — это плод совместных усилий трех восточнославянских народов, выработавших эту величайшую культурную ценность на основе единого церковнославянского языка и разнообразия народных говоров. Процесс этот был длительным и сложным, но творческий гений Пушкина синтезировал в единую систему разнообразные речевые стихии и влияния. Вот почему произведения поэта так близки и понятны читателям всех возрастов и профессий в России, на Украине и в Беларуси.

Пушкин знал, любил историю и культуру "белорусцев" (так еще в начале XIX века называли в России коренных жителей Белой Руси). В своей рецензии на "Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа Белорусского", помещенной в 1836 году в первой книге только что основанного им журнала "Современник", поэт сказал о белору-

сах — “народ, издревле нам родной”. Причину же своего интереса к трудам Конисского поэт объяснил уже в начале рецензии: “Георгий есть один из самых достопамятных мужей минувшего столетия. Жизнь его принадлежит истории”. С восхищением пишет Пушкин о многолетней упорной борьбе архиепископа с проникновением Ватикана на белорусские и украинские земли, против последствий Брестской унии 1596 года, о его непоколебимой верности православию, личном бесстрашии и мужестве.

Еще одна яркая страница в жизни поэта — это творческие связи Пушкина и Мицкевича. В недалеком прошлом идеологические службы двух стран предпринимали немалые пропагандистские усилия по превращению этой дружбы в символ всеобщего братства, игнорируя тот факт, что при всей искренности и сердечности взаимоотношений двух великих поэтов последние постоянно полемизировали друг с другом по межнациональным вопросам. Значительное место в этой полемике занимали исторические судьбы белорусского и украинского народов. Рецензия Пушкина на произведения Георгия Конисского, возможно, не напрямую, но косвенно как бы подводила итог этой затянувшейся полемике, в том числе и по оценке роли польского восстания 1830–1831 годов в российско-польских и в целом в межславянских отношениях. В августе 1834 года Пушкин написал стихотворение, посвященное польскому поэту, “Он между нами жил...” В нем, вспоминая свои встречи с Мицкевичем, воссоздавая его благородный облик, русский поэт, веря в мирный путь преобразования России, отвергает революционные идеи Мицкевича, упрекает своего друга во враждебном отношении к русскому государству. Питая искреннее уважение к патриотизму Мицкевича и всех поляков, он призывал их к такому же отношению к позиции русских людей по отношению к национальным интересам страны.

Стихотворение “Он между нами жил...” Пушкин не закончил, но написанные им строки свидетельствуют, что русский поэт стремился развеять атмосферу отчужденности и примириться с Мицкевичем. Пушкин до этого дважды, в 1820 и в 1824 годах, проезжал через Белоруссию, останавливаясь в таких ее городах и местечках, как Белица, Чечерск, Могилев, Орша, Бабиновичи, Витебск и Полоцк. Остается только сожалеть, что пути-дороги поэта не прошли по Гродненщине и Новогрудчине, столь любовно воспетых Мицкевичем. Кто знает, случись это, и их “славянский спор” не был бы столь острым. Однако судьбе было угодно привести сюда спустя десятилетия старшего сына русского поэта Александра (1833–1914), в полной мере выполнившего завет отца: “Не дай бог ему идти по моим следам, писать стихи да ссориться с царями!” По окончании Пажеского корпуса он стал профессиональным военным, дослужившись впоследствии до чина генерала кавалерии.

В 1860-е годы Александр Александрович находился на службе в Виленском военном округе. Будучи членом государственной комиссии по крестьянским делам, он исколесил принеманский край вдоль и поперек, навсегда полюбив его трудолюбивый и добрый народ, великолепную природу. Часть, в которой служил старший сын Пушкина, одно время была расположена в Новогрудке. Здесь ему пришлось вторично (в 1861 году скончалась, не дожив до года, дочь Соня) познать отцовское горе, в ноябре 1870 года умер пятимесячный сын (восьмой ребенок в семье). Его могила заботами горожан, почитающих все, что связано с именем великого поэта, сохранилась до наших дней. За скромной металлической оградой всяк пришедший на старое городское кладбище может увидеть из натурального камня надгробие, надпись на котором гласит: “Младенец Петр Пушкин. Род. июня 1870 г. Сконч. ноября 1870 г.” Даже зимой на детской могилке можно увидеть цветы...

Первым ребенком в семье старшего сына поэта (Александр Александрович был отцом 13 детей) была дочь Наталья. В 1881 году она вышла замуж за сослуживца своего отца П. А. Воронцова-Вельяминова. Выйдя через некоторое время в отставку, Павел Аркадьевич поселился с женой в имении своей матери Вавуличи (сейчас деревня Дубовка), что в 10–12 км от Бобруйска. Так внучка Пушкина оказалась в Белоруссии. Здесь она и закончила свой земной путь. В центре деревни Телуша на Бобруйщине под вековыми липами, рядом с братской могилой воинов, погибших в Великую Отечественную войну, находится скромная могила с надписью на сером гранитном надгробье: “Наталья Александровна Пушкина. По мужу Воронцова-Вельяминова. 3 декабря 1912 г. 53 лет”. Бережно ухаживают за могилой внучки поэта жители деревни, ученики местной школы. В 1979 г. на ее могиле был установлен новый памятник.

С Белоруссией была связана жизнь и деятельность дочерей Натальи Александровны — Марии (в замужестве Клименко) и Софьи (в замужестве Кологривова). В 1916 году правнучка поэта Софья вышла замуж за Всеволода Александровича Кологривова. Представители этого старинного дворянского рода не за страх, а за совесть служили России. Один из Кологривовых — генерал Андрей Семенович был начальником кавалерийских резервов в Отечественную войну 1812 года. Под его командованием в Бресте служил в 1813–1816 годах А. С. Грибоедов, автор знаменитой комедии “Горе от ума”. Брат Всеволода Юрий в начале 1900-х годов приобрел себе земли на Минщине. Сам Всеволод Кологривов служил офицером-артиллеристом на территории Гродненской и Сувалковской губерний, принимал участие в первой мировой войне, а в 1915 году после ранения был уволен в отставку. Имеющиеся в Национальном архиве (г. Гродно) материалы свидетельствуют о том, что один из братьев Кологривовых — Геннадий Александрович служил

в 1904–1905 годах помощником правителя канцелярии гродненского губернатора. В его обязанности, кроме прочего, входило наблюдение за типографиями, литографиями и т. п. заведениями, а также за книжной торговлей в Гродненской губернии. Зимой–весной 1905 года он исполнял обязанности редактора неофициальной части "Гродненских губернских ведомостей".

Тесно был связан с Белоруссией и младший сын Пушкина Григорий (1835–1905), несколько лет служивший в гвардии, а затем чиновником. Умер он бездетным в имении своей жены под Вильно.

Не менее остро осознавали потребность в поэзии Пушкина ее гродненские поклонники, оказавшиеся не по своей воле гражданами Польского государства. В обстановке культурного и национального наступления польских властей на так называемое русское национальное меньшинство, включавшее русских, белорусов и украинцев православного вероисповедания, последнее было вынуждено с целью сохранения русского языка и русской культуры объединиться в Русское благотворительное общество (1924–1939). Многоплановая деятельность этой культурно-просветительной организации (инициативными деятелями ее гродненского отделения были В. В. Кошелев, А. В. Наумок, Н. А. Червяковский, А. Ф. Оттович-Стольская, К. Н. Цитович и др.) оказывала в те годы значительное влияние на культурную, общественную жизнь города и была посильным противодействием национальному и религиозному угнетению со стороны тогдашних властей. Стержневым мероприятием местного отделения общества было празднование Дня русской культуры, проводившегося в день рождения А. С. Пушкина. Инициатива проведения подобного праздника, объединившего людей, считавших русскую культуру своей, принадлежала Союзу русских просветительных и благотворительных обществ в Эстонии. В 1924 году они впервые успешно отметили день рождения поэта, назвав его Днем русского просвещения. С 1925 года Пушкинский день стал главным праздником русского зарубежья, приобретя новое название — День русской культуры.

Ежегодно, начиная с этого года, его отмечали и люди русской культуры в Гродно. К этому знаменательному событию в городе членами общества издавалась однодневная газета. Название ее в разные годы менялось — "Зарница", "Наш день", "Русский день" и др. В программе праздника традиционно проводились торжественные собрания с докладами о жизни и творчестве Пушкина, других деятелей русской истории и культуры, о знаменательных исторических датах, о жизни русских меньшинств в других странах, а также постановка спектаклей по произведениям А. Пушкина, А. Островского, А. Чехова, организовывались концерты. В них принимали участие популярные в русском зарубежье артисты, а также местные художественные таланты. Настоящими лю-

бимцами гродненской публики в 30-е годы были исполнители романсов, а также классических музыкальных произведений на слова А. Пушкина, С. Андреева и К. Шилейко. Последний до приезда в Гродно был ведущим тенором Белградской оперы.

Кульминацией празднования Пушкинского дня за пределами России стал 1937 год. В тот год исполнилось сто лет со дня гибели поэта. Беспрецедентная культурная акция проводилась во всех пяти частях света — всего в 42 государствах и в 231 городе. И город Гродно не был последним в этом списке. В 1939 году гродненский воевода без объявления причин запретил деятельность в городе местного отделения Русского благотворительного общества, вместе с ним ушло в историю традиционно возвышенное празднование Пушкинского дня.

В советские времена день рождения великого поэта в Гродно праздновали, как правило, официально и сухо, почти незаметно. Канонизируя имя Пушкина, государственные чиновники не допускали никакой “самодеятельности снизу”. Приятным исключением можно назвать здесь лишь постановку областным драматическим театром спектакля “Александр Пушкин” Д. Дэля (1949, режиссер Т. Гагава), создание гродненским художником И. Пушковым работ “Мицкевич и Пушкин в Петербурге”, “Портрет Пушкина” (1965–1966), присвоение имени поэта улице города, кинотеатру в занеманской части и Областной детской библиотеке.

В нынешних условиях необходимо сделать все для того, чтобы предстоящий 200-летний юбилей А. С. Пушкина в полной мере отразил глубокую любовь гродненцев к светлому гению поэта.

*1997*

*Алена Кліменка*

# МАЯ ПУШКІНІЯНА

З першага погляду кватэра Ільі Лазаравіча Шафтана здаецца звычайнай. Але варта расчыніцца дзверцам шафы — планшэты з тысячнай “арміяй” значкоў, клясеры з манетамі, альбомы з маркамі-паштоўкамі, статуэткі, барэльефы і мноства іншых самых разнастайных рэчаў наводзяць на думку, што гэта — хатні музей імя Пушкіна.

Самыя старыя экспанаты — канверты 1962 года выпуску з гомельскім штэмпелем: “Пошта. 10.02.1962 г. 125 год з дня смерці Пушкіна”. Самыя новыя — санкт-пецярбургскія паштовыя карткі з надпісам “200 год з дня нараджэння Пушкіна. 1799–1999”. Менавіта да гэтай даты, якая мае адбыцца, Ілья Лазаравіч плануе арганізаваць гарадскую выставу. За яго плячыма — дзесяцігадовы калекцыянерскі стаж. Ён ведае, што трэба пакруціцца не адзін год, каб паказаць шырокім масам сваю Пушкініяну. Асноўнае — неабходна сістэматызаваць усе экспанаты, каб яны чыталіся як кніга. Аднак каб мара здзейснілася і калекцыя “вырвалася” з цеснай шафы ў прасторную выставачную залу, жадання аднаго, нават вельмі энергічнага чалавека, недастаткова. Патрэбны мецэнаты.

— Я спадзяюся, што паклоннікі Пушкіна, даведаўшыся аб маіх планах, дапамогуць мне, — выказаў сваю думку Ілья Лазаравіч. — Магчыма, гэта будуць... нашчадкі вялікага паэта, якія жывуць у Беларусі. Таму што, вядома, у свой час паэт праязджаў і нават бываў у беларускіх гарадах і мястэчках: Магілёве, Оршы, Віцебску, Полацку, Чачэрску, Беліцы, Бабінавічах.

— Ілья Лазаравіч, пэўна, калекцыяніраванне ў вашым жыцці займае не апошняе месца?

— Так, працую аж з трынаццацігадовага ўзросту. Але я не музейны супрацоўнік і не дзеяч мастацтва, а звычайны рэзчык па металу. А вось калекцыяніраваць пачаў з рэчаў, звязаных з імем Леніна, нават у майго сына імя Уладзімір Ільіч, а ў дачкі — Марыя Ільінічна. Трохі пазней мяне зацікавілі экспанаты на касмічную тэматыку, а таксама матэрыялы пра Сталіна, Варашылава, Молатава, Дзяржынскага, Фрунзе. Дарэчы, я працую на заводзе імя Арджанікідзе і таксама цікавіўся гэтай асобай. Дзякуючы гэтай сваёй калекцыі я стаў лаўрэатам другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці — за ўдзел у выставе. І вось

у апошні час мяне вабіць асоба Пушкіна — генія, якім ганарыцца не толькі Расія, але і ўсё чалавецтва. Практычна не выязджаючы з Мінска, я і сабраў сваю калекцыю.

— Праўду кажуць, што лепей адзін раз убачыць... Ці ведаюць сябры, супрацоўнікі пра ваша захапленне?

— На заводзе многія лічаць мяне дзіваком. А калегі-калекцыянеры шмат разоў бывалі ў мяне. Мне здаецца, што дзякуючы свайму хобі я стаў больш духоўным, а таксама больш уважлівым у адносінах да сваёй жонкі.

Ілья Лазаравіч раптоўна ўзяў у рукі партсігар, на вечцы якога ціснёны партрэт Пушкіна.

— Дарэчы, сам я ўжо не куру тры гады без усякага кадзіравання — неяк сама сабой узнікла агіда да тытуню, а магчыма, таксама пад уплывам майго захаплення. Наогул я стаў больш энергічным, шмат хаджу пешшу. А мая "любімая марка машыны" — веласіпед, на якім я езджу ў калекцыянерскія клубы. Паглядзіце на вось гэтыя самаробныя значкі, — прапанаваў Ілья Лазаравіч, — зроблены спецыяльна па майму заказу: яны ў тоненькіх, зграбных рамачках. Такіх арыгінальных значкоў-фотапартрэцікаў больш ні ў кога няма.

А маленькія фотаздымачкі, з якіх выраблены значкі, мне даслалі з музея ў Міхайлаўскім. Вось партрэцік — значок з партрэтам нянькі Арыны Радзівонаўны. Прапаную паглядзець цікавыя, яркія значкі і паштоўкі з ілюстрацыямі да яго казак: "Казка пра рыбака і рыбку", "Казка пра папа і яго работніка Балду"... Звярніце ўвагу на фотаздымак гор, зроблены ў Нальчыку. Угадваецца пушкінскі профіль?..

Ілья Лазаравіч усё адкрываў, адкрываў скарбніцу сваёй калекцыі: даставаў з хатніх "тайнікоў" новыя экспанаты: кнігі, міні-кніжачкі, брашуры. Затым "разрулоніў" плакат "Радаслоўная Пушкіна — гісторыя Расіі".

— Аказваецца, сярод продкаў паэта па прамой лініі былі і вельмі вялікія асобы: Уладзімір І Чырвонае Сонейка, Яраслаў Мудры, Уладзімір Манамах. З пабочнай галіны: Юрый Далгарукі, Ізяслаў Уладзіміравіч, князь Полацкі, Аляксандр Неўскі, Дзмітрый Данской...

*1993*

*Сяргей Грахоўскі*

## СУСТРЭЧА З ЛУКАМОР'ЕМ

Прайсціся па пушкінскіх сцежках марыў з маленства. І вось мара спраўдзілася: мяне запрасілі на свята паэзіі ў Міхайлаўскае ў 175-ю гадавіну Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна.

Едзеш па пскоўскай зямлі, побач імчацца аўтобусы, машыны, трактары, пыліць дарога, а ўяўляецца, што недзе калываецца рэсорны вазок са скураным верхам і з яго вось-вось выгляне знаёмае аблічча з кучаравымі бакенбардамі і белазубай усмешкай. Як на святыні, гляджу на дубы, што некалі засланялі яго ад навальніц, хаджу па алеях, дзе некалі адзінокі выгнаннік таропка запісваў натхнёныя радкі, што хвалявалі нашых папярэднікаў, хвалююць нас, будуць хваляваць нашых нашчадкаў. Тут праз пласты вякоў чуліся паэту галасы Барыса Гадунова, Марыны Мнішак і мудрага Пімена, тут з'яўляліся раздзелы "Яўгенія Анегіна" і строфы "19 кастрычніка". Каля гэтых састарэлых, запламбіраваных цэментам ліп яму сустрэўся "гений чистой красоты".

Гляджу на елкі і ліпы, гладжу іх шурпатую кару, да якой дакраналася ЯГО рука, і здаецца, яшчэ відны на вільготных сцяжынках яго сляды. Свята Пушкінскай паэзіі падаравала яшчэ адну незабыўную сустрэчу. З жывым Пушкіным. Так, так, Пушкіным. Яго я ўбачыў трохі раней, за абедам у пскоўскай гасцініцы. У вялікай зале не змаўкала гамана: жартаваў нястомны Іраклій Андронікаў, у воблаку тытунёвага дыму паблісквалі вялікія чорныя вочы экспансіўнага Паўла Антакольскага, у канцы пакоя сядзеў у круглых акулярах спакойны Мікола Бажан, пра нешта захоплена гаварыла Агнія Барто Маргарыце Алігер і Кацярыне Шавялёвай. Стракацелі цюбецейкі і фескі, шматкалёрная экзотыка вопратак Індыі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, касцюмы і гальштукі гасцей амаль з усіх краін свету.

Сярод іх недзе павінен быць праўнук вялікага паэта. Яго дзедам быў старэйшы сын Аляксандра Сяргеевіча — Аляксандр. Ён дажыў да 1914 года і, бясспрэчна, трымаў на руках свайго ўнука Грышу, як некалі няньчыў яго славуты бацька. Адразу ўявіў такую блізкую сувязь пакаленняў, і здалося, што ў дотыку рукі майго сучасніка адчуў цяпло далоні вялікага паэта.

Пільна ўглядаюся ў аблічча, дзе той праўнук Пушкіна. Праўнук! Гэта ж зусім блізка. Праўнукаў маюць ужо некаторыя мае знаёмыя.

Думаю, павінны, павінны ж быць хоць некаторыя рысы патомнага падабенства. Ага! Вунь каля акна сядзіць смуглявы паджары чалавек, у яго даўгаватым твары, прыпухлых павеках мільгнула нешта знаёмае.

— Вось гэта ён, — паказаў я маскоўскаму таварышу, які прывёў мяне на абед.

— Скажу Грыгорыю Грыгор'евічу, што яго пазнаюць, убачыўшы ўпершыню.

— І абавязкова пазнаёмце нас.

Пасля абеду ў гасцінічным холе я ўжо гаварыў з адзіным у нашай краіне прадаўжальнікам непарыўнай мужчынскай лініі роду Пушкіных. Гаварылі, як даўнія знаёмыя, як равеснікі. А калі ён даведаўся, што я з Беларусі, ажывіўся асабліва:

— Я ж ваяваў пад Віцебскам, а мой Саша толькі што адслужыў у арміі пад Брэстам.

Успамінаючы ваенную пару, Грыгорый Грыгор'евіч расказаў забаўны эпізод. У баі непадалёк ад Віцебска ён узяў у палон гітлераўскага афіцэра і даставіў у штаб. Пасля допыту палоннаму сказалі, што яго ўзяў і даставіў праўнук славутага паэта Пушкіна. Немец адмоўна затрос галавою: "Не-э, гэтага быць не можа. Пушкін быў дваранін, а бальшавікі ўсіх дваран вывезлі ў Сібір". Грыгорый Грыгор'евіч рассмяяўся і расказаў, што яго бацька быў баявым палкоўнікам у часе першай імперыялістычнай вайны, а ў 1917 годзе адразу перайшоў на бок рэвалюцыі, пад камандаю К. Я. Варашылава ўдзельнічаў у баях з белагвардзейцамі на Паўднёвым фронце і камандаваў палком да дэмабілізацыі ў 1921 годзе. Потым персанальны пенсіянер Грыгорый Аляксандравіч Пушкін доўгі час быў навуковым супрацоўнікам рукапіснага пушкінскага аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя Леніна.

Усе дні свята паэзіі мы не разлучаліся з Грыгорыем Грыгор'евічам, яго жонкай Марыяй Іванаўнай і сынам Сашам. Разам хадзілі па Пскову, па Пушкінскіх Гарах, Трыгорскім, Пятроўскім. Праўнук Пушкіна кожны год прыязджае сюды на свята паэзіі, але не перастае здзіўляцца і захапляцца, колькі зроблена і робіцца па аднаўленню гэтага унікальнага запаведніка. Фашысты тут усё спапялілі датла. Адразу пасля вайны з салдацкай торбачкай, але з гарачым сэрцам прыехаў сюды ўлюбёны ў паэзію Пушкіна бязрукі франтавік Сямён Сцяпанавіч Гейчанка. Хадзіў па папялішчах, знаходзіў кавалачкі кафлі, абгарэлыя ручкі ад дзвярэй, клямкі, ашмёткі цудам ацалелых шпалераў, запісваў успаміны мясцовых сялян, як выглядаў кожны будынак, месяцамі вывучаў матэрыялы ў бібліятэках і архівах, ездзіў і хадзіў па ўстановах, па фарфоравых і ткацкіх фабрыках, архітэктурных майстэрнях і будаўнічых трэстах, і вось усё ажыло, стала такім, як было пры Пушкіне. Цяпер гэты чарадзей, няўрымслівы страж і казачнік пушкінскага Лукамор'я стаў душою гэтай усенароднай святыні.

Стрымана, нібы саромеючыся цікаўнасці да сваее асобы, сёе-тое расказваў Грыгорый Грыгор'евіч пра сябе. Пасля сямігодкі ў падмаскоўным гарадку Лопасня ў 1932 годзе ён скончыў тэхнікум і працаваў ва Усесаюзным інстытуце жывёлагадоўлі лабарантам. У 1934 годзе па спецнабору пайшоў у Чырвоную Армію, потым камсамол накіраваў яго ў маскоўскі крымінальны вышук. У верасні 1941 года добраахвотнікам пайшоў у партызанскі атрад, створаны пад Нара-Фамінскам. Быў разведчыкам, камандзірам атрада асобага прызначэння. Пасля раненняў і шпіталяў трапіў на Заходні фронт. Узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны стаў друкаром у друкарні "Правды".

А Саша? Грыгорый Грыгор'евіч жартам скардзіцца:

— Вось угаворваю жаніцца, а ён марудзіць. Нельга ж, каб перапыніўся пушкінскі род.

Саша ўсміхаецца і парыруе бацьку:

— Дык і ты ж не надта яго павялічыў. Адзін я.

Загаварылі мы і пра нашчадкаў Пушкіна ў Беларусі. Я ўспомніў, што ў 1931 годзе пасля рагачоўскіх педкурсаў у Глуск прыехала прапраўнучка Пушкіна Вольга Яўгенаўна Кліменка. Паслалі яе ў Азямлянскую школу. Яна вучылася і сябравала з маёю дваюраднай сястрой, некалькі дзён жыла ў майго дзядзькі. Яна мне запомнілася маладзенькай, з кучаравымі светлымі валасамі, заўсёды маўклівай і задуменнай.

Грыгорый Грыгор'евіч сказаў, што жыве яна цяпер у Архангельску, да пенсіі настаўнічала, часам піша лісты, а бываючы ў Маскве, заходзіць адведаць. Наогул усе нашчадкі вялікага паэта жывуць вельмі дружна, падтрымліваюць сувязь, робяць усё магчымае для ўвекавечання памяці свайго вялікага продка. [...]

Напярэдадні ў Пскове імжыў дождж, а Пушкінскія Горы сустракалі ясным небам і шчодрым сонцам. Вуліцы былі забіты аўтобусамі з самымі нечаканымі адрасамі далёкіх і блізкіх гарадоў і гарадкоў. Каля Святагорскага ўзвышша — процьма народу — ідуць пакланіцца праху любімага паэта. Павел Антакольскі спыніў і наш аўтобус, лёгка саскочыў з прыступкі і хуценька пабег па стромкай лесвіцы да манастыра.

— Гэта ён робіць заўсёды. Хоць мы і парушаем графік, хто хоча за Паўлам Грыгоравічам, калі ласка, толькі ненадоўга, — прапанаваў Андронікаў.

Да Пушкіна пайшлі ўсе.

Больш за сто тысяч людзей розных узростаў зляцелася, з'ехалася, сышлося ў запаветны пушкінскі край, на зямлю, асветленую вечна юнай паэзіяй генія. Пушкінскія радкі скандзіравалі паэты Балгарыі і Індыі, Венгрыі і Інданезіі, Чэхаславакіі і Ліберыі, Канады і Аўстраліі, Францыі і Ганы, Турцыі і Сьера-Леоне. А прадстаўнік Эфіопіі з гонарам паўтараў: "Нашы продкі падарылі вам Пушкіна". Каб было чалавеку прыемна, ніхто яму не пярэчыў. Усе былі з'яднаныя адзінай любоўю да

паэзіі Пушкіна, усе прыйшлі пакланіцца ўзгоркам Міхайлаўскага і Трыгорскага, памаўчаць над цёмнымі сажалкамі; і Пушкін бачыў у іх адбіткі неба, пазалочаных сонцам сосен і белых воблачкаў чаромхавых гаёў.

На старасвецкім кургане каля Трыгорскага пазнаём той самы дуб, пра які паэт пісаў:

Гляжу ль на дуб уединенный
И мыслю: патриарх лесов
Переживет мой век забвенный,
Как пережил он век отцов.

Ці не вакол гэтага волата хадзіў на залатым ланцугу і гаварыў казкі кот вучоны? Ці не з вышыні гэтага кургана ўглядаўся Пушкін у будучае Расіі?

Увесь час не пакідае адчуванне, што ён недзе тут, побач. Можа, задуменны ідзе па суседняй алеі ці конна імчыцца на Саўкаву горку. Пушкін настолькі жывы, што ніяк нельга пагадзіцца з апошняй старонкай яго біяграфіі. Ён пасяліўся ў нашых сэрцах, сагрэў душу, асвятліў розум і акрыліў волю кожнага з нас. Без Пушкіна, без уплыву яго натхнёнага гарэння, без уздзеяння яго свабодалюбнай музы нельга ўявіць ніводнага добрага і шчодрага чалавека. Пушкін заўсёды з намі. Пушкін заўсёды ў нас.

Нават калі тысячы людзей разам з паломнікамі з усіх кантынентаў узышлі на крутаяр Святагорскага манастыра, да магілы паэта, адчуванне прысутнасці жывога Пушкіна не зменшылася.

Брожу ли я вдоль улиц шумных,
Вхожу ль во многолюдный храм,
Сижу ль меж юношей безумных,
Я предаюсь моим мечтам... —

ціха і натхнёна чытаў Іраклій Андронікаў, а здавалася, гучаў жывы пушкінскі голас.

Магіла патанала ў безлічы вянкоў, а вянок з блакітных незабудак, сабраных на берагах Сораці нашчадкамі паэта, кранаў да болю ў сэрцы, да слязы. З-за сцен Успенскага сабора плылі прыглушаныя гукі хору: пад акампанемент арфы гучалі пушкінскія строфы.

У саборы мігалі свечкі, а з вузкага акенца пад купалам падаў сноп сонечных праменняў і зіхацела блакітнае неба.

Сижу за решеткой в темнице сырой... —

на самай высокай ноце гучаў чароўны голас народнага артыста Савецкага Саюза Івана Сямёнавіча Казлоўскага. Як водгулле далёкай навальніцы, наплываў рокат хору, а звонкі тэнар артыста зіхацеў над гэтым

гулам бляскам маланкі. У такія хвіліны забываешся пра ўсё, жывеш у свеце паэзіі і музыкі.

Раптам у маўклівым натоўпе я ўбачыў вельмі знаёмы твар і аслупянеў. Хвалістыя каштанавыя валасы, выразныя вочы і вусны, нават складачкі каля іх нагадалі вядомы партрэт работы Кіпрэнскага. Няўжо прывід? Не, ява: стаяў і слухаў прапраўнук вялікага паэта Аляксандр Пушкін. Дзівоснае падабенства адгукнулася праз чатыры пакаленні. Саша Пушкін нядаўна вярнуўся ў Маскву з Савецкай Арміі, працуе шафёрам і рыхтуецца ў інстытут. Любіць тэхніку і паэзію. Да яго прыглядаліся ўсе, звярталі ўвагу знаёмых, а ён губляўся, апускаў галаву і знікаў у натоўпе.

А натоўпу не было ні межаў, ні краю. Тысячы людзей прыляцелі, прыехалі, прыйшлі на зялёную паляну каля Міхайлаўскага ў госці да Пушкіна. У кожнага ў руках стосік кніг вялікага паэта. Збіральнікі аўтографаў бяруць у палон пісьменнікаў. Мяне атакуюць землякі з Мінска, Віцебска, Баранавіч і Гродна. Яны прыехалі загадзя, каб сэрцам дакрануцца да вечна жывой крыніцы яго натхнення, каб зноў і зноў перажыць яго хваляванні, радасці і трывогі, перадумаць яго думы.

Успамінаецца адзін радок з біяграфіі Пушкіна: у 1824 годзе па загаду міністра Несельродэ апальнага паэта пераводзілі з адэскай ссылкі ў Пскоўскую губерню. Змардаваны бездаражжу Пушкін 5 жніўня прыехаў у Магілёў. Але адпачыць не давялося — любімага паэта пазналі прыхільнікі яго таленту, падхапілі на рукі, частавалі, прасілі чытаць і чытаць вершы. Я гэта ведаў даўно, але напісаць адважыўся, толькі збіраючыся ў Міхайлаўскае. Вось некалькі радкоў:

...Пазналі, узнялі на рукі, —
Не адпрасіцца, не ўцячы.
І не змаўкаюць песень гукі
Да самай раніцы з начы.
Кіпяць і пеняцца бакалы,
Маланка б'е на ўсе бакі,
Грымяць вышэйшага напалу
Вольналюбівыя радкі.

У паўдня пачынаецца свята паэзіі, свята Пушкіна. Над палянаю, над лясамі, над міхайлаўскімі ўзгоркамі і азёрамі гучыць голас славутага пісьменніка і літаратуразнаўцы Іраклія Андронікава. На мітынгу палымянага Паўла Антакольскага змяняе Фікрэ Таласа з Эфіопіі, Маргарыту Алігер — індыйская паэтэса Айн-Хайда, гучаць словы прызнання ў любові, шчырай удзячнасці вялікаму паэту на ўсіх мовах зямлі.

Як спеў жаўранка, над пушкінскімі прасторамі звініць голас Івана Сямёнавіча Казлоўскага. Песня змяняе песню. Магутным харалам коціцца над зямлёю: "Пушкіну слав-а-а!" І адгукаецца рэха запаветных лясоў: "Сла-а-а-в-а-а!"

Зноў гучаць на мовах народаў савецкай зямлі, на мовах свету несмяротныя радкі:

> Слух обо мне пройдет по всей Руси великой,
> И назовет меня всяк сущий в ней язык...

Даўно прайшоў! Даўно паўтараюць нашчадкі вечна жывога паэта яго імя, радкі сучасніка ўсіх пакаленняў, нашага сучасніка, разняволенага і вернутага свайму вольнаму народу.

Паўтара стагоддзя назад адважны гуманіст і інтэрнацыяналіст Аляксандр Сяргеевіч Пушкін марыў пра час,

> Когда народы, распри позабыв,
> В великую семью соединятся.

І цяпер у сэрцах і памяці добрых і разумных людзей свету жывуць яго нязгаслыя словы: "Да здравствует солнце, да скроется тьма!"

Пушкінскае свята паэзіі ідзе па Ягоных дарогах, шляхамі яго несмяротнай славы: Адэса і Болдзіна, Кішынёў і Грузія, стэпы Калмыкіі і Арэнбуржжа слухаюць натхнёныя словы нашчадкаў Пушкіна, мільёны ідуць да яго, раяцца з ім, захапляюцца яго звонкай, чыстай і вечнай паэзіяй.

Закончылася свята, а да Пушкіна ідуць і ідуць людзі ўсіх узростаў і прафесій. Больш за 500 тысяч аматараў паэзіі праходзяць пад векавымі дубамі і соснамі Міхайлаўскага кожны год. Прыходзяць, спыняюцца каля каменя, на якім выбіта: "Здравствуй, племя младое, незнакомое". І кожны адказвае:

— Дзень добры, Пушкін!

*1986*

*Анатоль Вярцінскі*

# У ПУШКІНА

“Болдзінская восень”. Болдзіна. “Обитель дальняя трудов и чистых нег”.

Сапраўды дальняя, далёкая. Для Пушкіна — у прасторы. Для нас — і ў часе.

За дальнасцю і за даўнасцю яно, гэтае сяло, было — для мяне асабіста — нечым амаль нерэальным, абстракцыяй. Так, каму невядома, што лёс закінуў Пушкіна ў яго радавы маёнтак Болдзіна, што тут ён марыў аб сваім шлюбе з юнай прыгажуняй Наталляй Ганчаровай, ірваўся да яе, але яго трымаў каранцінны палон, і паэт — няма ліха без дабра — вымушаны быў пісаць і стварыў за тры месяцы шмат выдатных твораў, якія ўвайшлі ў залаты фонд рускай і ўсёй сусветнай літаратуры... Каму гэта невядома? Але гэта разам са школьным урокам адыходзіць у мінулае і робіцца далёкім, як паданне. І калі ты верыш у Міхайлаўскае і Ясную Паляну, то вера твая ў Болдзіна толькі на гэтым паданні і трымаецца. Дзе ты — Болдзіна? У якім кутку неабдымнай зямлі рускай? Якое ты, калі ты ўсё ж існуеш у сапраўднасці?

Болдзіна адгукаецца, Болдзіна дае пра сябе знаць. Самым сучасным, самым рэальным, самым звычайным спосабам. З Болдзінскага музея-запаведніка А. С. Пушкіна (жыве Болдзіна, ёсць такі музей!) прыходзіць у Саюз пісьменнікаў запрашэнне прыняць удзел у юбілейных урачыстасцях. Пушкінскае Болдзіна запрашае ў госці! І мы з Петрусём Макалём выпраўляемся ў шлях.

“Если ехать вам случится...” Ляцім да Масквы самалётам, адтуль, другім самалётам, да Горкага. А з Горкага дабіраемся да сяла Вялікае Болдзіна (у адрозненне ад другой назвы — Малое Болдзіна). Недзе на паўдарозе пачынаеш памалу адчуваць не зусім звычайнае, трывожна-шчымлівае хваляванне — хваляванне паломніка. Яно звязана ў падсвядомасці з адчуваннем, што ты пераадольваеш не толькі прастору, але і рухаешся ў часе. Пачынае наогул змяшчацца ўяўленне аб часе. Упершыню я перажыў такое адчуванне, калі наведаў Жалудок у пошуках слядоў Валерыя Урублеўскага. Цяпер яно зноў было ў душы. І яно, па меры набліжэння, усё мацней і мацней забірала сэрца. І ўзмацнялася яшчэ тым, што я ўзяў з сабой у дарогу томік пісем Пушкіна і мы іх перачытвалі... “Я ад’язджаю у Ніжні, не ведаючы, што мяне чакае ў бу-

дучым... Восень падыходзіць. Гэта любімы мой час — здароўе маё звычайна мацнее — пара маіх літаратурных турбот, — а я павінен клапаціцца пра пасаг ды пра вяселле, якое згуляем бог ведае калі... Еду ў вёску, бог ведае, ці буду там мець час займацца і душэўны спакой, без якога нічога не зробіш, акрамя эпіграм на Качаноўскага... Мая дарагая, мая мілая Наталля Мікалаеўна, я ля вашых ног, каб падзякаваць вам і прасіць даравання за прычыненыя вам турботы... Даношу табе, майму ўладару, што сёлетняя восень была дзетароднай і што калі твой пакорны васал не здохне ад сарацынскага паморку, халерай названага і занесенага нам крыжовымі воінамі, гэта значыць бурлакамі, то ў замку тваім, “Литературной газете”, песні трубадураў не змоўкнуць круглы год... Што за цуд тутэйшая вёска! Уяві: стэп ды стэп: суседзяў ні душы; ездзі вярхом колькі табе хочацца, пішы дома колькі ўздумаецца, ніхто не перашкодзіць... Я жыву ў вёсцы, як на востраве, акружаны каранцінам...”

Гулі маторы, пагойдваўся самалёт, транспарт быў самы што ні ёсць сучасны, але ў той жа час гучалі словы Пушкіна, за імі чуўся яго такі натуральны — то ўзрушаны, то пяшчотны, то іранічны, то жартаўлівы — голас, мы ляцелі да яго ў госці, і сцены часу бурыліся, падалі... Знаёмае паломнікам адчуванне.

...“Стэп ды стэп...” Як толькі мы, прыехаўшы, агледзеліся, адразу яго ўбачылі, убачылі вакол раздольную раўніну, з невялікімі ўзгоркамі і пералескамі. Тут жыў, тут быў, тут тварыў Пушкін... Шмат змянілася з тых часоў, шмат вады сплыло ў мясцовай рачулцы Азанцы, на якой стаіць сяло Болдзіна, але засталося гэтае зялёнае поле, гэтыя ўзгоркі, гэтыя гаі, гэтая дарога, па якой паэт любіў ездзіць вярхом на кані. І гэты вось драўляны дом, да ганка якога падкаціў са званочкам шмат год назад упершыню “малады пан” і дзе зараз знаходзіцца музей-запаведнік. І гэты парк, гэты сад, гэтыя зеленаватыя ад бросні сажалкі, гэтыя гнёзды і несціханы грачыны грай. І гэтая стапяцідзесяцігадовая, з засохлай вяршалінай, лістоўніца, якую, паводле падання, прывёз з Урала і пасадзіў сам Пушкін. І гэтая агромністая, з яўнымі адзнакамі свайго ўзросту вярба, на рахунку якой каля двухсот год. У гэтым краі прырода шчодрая на час, на даўгалецце. І не толькі ў дачыненні да дрэваў. Больш за сто год жыў і бярог памяць пра паэта яго сучаснік, болдзінскі селянін Міхей Сівохін. Столькі ж жыла другая яго сучасніца, прыгажуня, дачка мясцовага пчаляра Фяўронння Вілянава, якая пранесла праз гады і перадала патомкам сказаныя Пушкіным перад ад’ездам словы: “Якія вы мае падданыя, — я ваш падданы”. Шматгадовым захавальнікам болдзінскай старыны быў унук пушкінскага пісара Іван Кірэеў... Наогул тут, у Болдзіне, павявае, як здаровым стэпавым прасторам, доўгажывучасцю. Дзякуючы супрацоўнікам музея-запаведніка мы сустрэліся з народным хорам сяла Болдзіна. У гэтым хоры спява-

юць жанчыны, адной з якіх, самай маладой, пяцьдзесят з нечым год, а астатнім ад сямідзесяці і больш. Самай старэйшай восемдзесят чатыры гады. Яна сядзела за сталом насупраць мяне (сустрэча адбывалася ў хаце адной з удзельніц хору, з застоллем, з самаварам). Ёй падлівалі час ад часу, паміж песнямі, гарэлкі, яна выпівала, выцірала рот сухенькай старэчай жменькай і пела зноў — моцна, звонка, залівіста.

Па дарозе ў Болдзіна змяшчэнне ў часе было ілюзорным. Тут жа сувязь часоў была надзіва адчувальнай, рэальна ўвасобленай. Проста не верылася, што вось так жыве ў сяле памяць пра паэта. Памяць не літаратурна-кніжная, не музейная, а жывая, чалавечая, сапраўды народная, памяць, якая ашчадна перадаецца з пакалення ў пакаленне. Хор спяваў цэлы вечар песні. Акрамя іншых (якое выкананне!) гучалі і тыя, якія ўжо спяваліся ў часы Пушкіна і запісваліся ім (“Цешчанька”, “Белая бярозанька”), рамансы на словы паэта. Песні перапыняліся размовай, расказамі, успамінамі. Пра Пушкіна гаварылі як пра чалавека, які нядаўна быў у гэтай хаце, як звычайна на сяле гавораць пра блізкага ўсім чалавека, які адсутнічае, але памяць пра якога трывала жыве ў сэрцы. Такая сапраўды народная любоў да свайго паэта не магла не хваляваць, не маглі не ўспомніцца зноў яго прарочыя словы пра сцежку, якая будзе весці да яго помніка і якую ён трапна назваў “народнай”. (У дужках прыгадаю, што, як гэта і заўсёды бывае ў жыцці, не абыходзіцца тут і без камічных момантаў. Артыст аднаго з горкаўскіх тэатраў А. Палеес, які выконвае ў некаторых фільмах ролю Пушкіна, — ён знешне вельмі падобны на паэта — расказваў нам: “Здымалі фільм “І зноў восень...” Я ехаў вярхом на кані, выглянула з хаты бабулька, убачыла мяне, пляснула рукамі: “Батюшки, барин воскрес!”)

Беларускія пісьменнікі былі на свяце ў Болдзіне ўпершыню, мы былі самымі далёкімі гасцямі, і нас вельмі цёпла прымалі. На вечары паэзіі, які адбыўся ў першы дзень прыезду ў раённым Доме культуры (Болдзіна зараз раённы цэнтр), мы чыталі свае пераклады з Пушкіна. Прызнаюся, што менавіта тут, на болдзінскай зямлі, я зрабіў першую спробу перакласці і ў сваім перакладзе прачытаць пушкінскія радкі:

Падымем і зрушым бакал да бакала!
Каб розум свяціўся, каб муза натхняла!
Ты, сонца святое, гары!
Як гэта лампада бляднее
Прад ясным усходам зары,
Так мудрасць уяўная гасне і тлее
Прад розумам, поўным святла!
Хай сонца заззяе, хай знікне імгла!

А потым нам было прыемна пачуць на вечары верш горкаўскага паэта Юрыя Андрыянава, прысвечаны Беларусі:

Как молчат твои чащи вещие,
Как бездонна рассветов стынь!
Душу жжет твою углем тлеющим
Деревенька лесная Хатынь.

Хвалюючае пачуццё блізкасці часоў і людзей перажывалі мы асабліва, калі слухалі выступленне другога горкаўскага паэта, па паходжанню беларуса, Генадзя Бядняева, які чытаў пранікнёныя радкі аб роднай Віцебшчыне.

На наступны дзень свята адбылося народнае гулянне ў маляўнічым гаі Лучыннік (так назваў гэта месца, паводле падання, сам Пушкін). І тут, на ўлонні чароўнай прыроды, апетай вялікім паэтам, мы мелі шчаслівую магчымасць зведаць чалавечы давер і добразычлівасць. Да нас падыходзілі людзі — адны таму, што іх жыццё ў свой час было звязана з беларускай зямлёй, другія проста так, каб сказаць добрыя словы, запрасіць у госці. Запомнілася тая зацікаўленасць, з якою гутарылі з намі аб сённяшняй літаратуры, аб яе дарозе да сэрца чытача педагог А. Кальякова, інжынер Л. Кастраміна, вучоныя Л. Асіповіч і І. Яскевіч.

Прыемна было бачыць і той энтузіязм, тую любоў, з якімі імкнуцца ахоўваць і памнажаць памяць паэта, павялічваць кола сяброў Болдзінскага музея-запаведніка яго дырэктар Ю. Левіна, супрацоўнікі Л. Часнова, Л. Малышкіна. Мы перадалі ім падарункі нашай пісьменніцкай бібліятэкі — творы Пушкіна на беларускай мове, кнігі Купалы і Коласа, аўтографы ўласных перакладаў пушкінскіх вершаў. Мы выказалі ім сваю ўдзячнасць за запрашэнне, за магчымасць адкрыць для сябе нанова Болдзіна — знакаміты куток рускай зямлі, у якім жыве светлы вобраз паэта-гуманіста.

*1980*

*Владимир Котов*

## НЕИЗВЕСТНЫЙ ПУШКИН?

Казалось бы, все “раскопали” исследователи творчества прародителя золотого века русской поэзии, наизусть знает любой школьник места, ставшие объектом народного паломничества в дни Пушкинских торжеств, поэтических праздников: Михайловское, Болдино, Мойка. Но есть, оказывается, единственный в своем роде литературный музей великого поэта. До сих пор он почему-то незаслуженно остается в тени, находится вдали от туристских маршрутов. Не слышали о нем знакомые литературоведы, писатели, даже дотошные собратья по перу — журналисты, которые, казалось бы, должны знать обо всем. И тем не менее, как это ни удивительно, в путеводителе по Вильнюсу отмечено: Литературный музей А. С. Пушкина, улица Субачяус, 124. Если сесть на десятый автобус на площади Гедиминаса и отправиться в живописное предместье Маркучяй, через пятнадцать минут окажешься у подножия лесистого холма, на котором и расположился старинный деревянный особняк — музей Александра Сергеевича Пушкина. Здесь в 1899–1905 годах жил с семьей младший сын поэта Григорий Александрович.

Дом стоит в дубовой роще — это остатки древней пущи, некогда шумевшей вокруг Вильно. Под кронами могучих деревьев в 1863 году собирались повстанцы, не раз бывал с друзьями Адам Мицкевич.

Маркучяй [Маркути. — *Ред.*] впервые упоминается в исторических хрониках XIV века. Вначале это была вотчина литовских князей, потом усадьба принадлежала различным знатным родам. В 1867 году Маркути купил генерал-инженер Алексей Мельников и построил здесь деревянный летний дом. В 1875 году имение с обширными землями получила в приданое его дочь Варвара, вышедшая замуж за поручика В. Машкова. Спустя несколько лет Варвара разошлась с мужем и какое-то время жила с дочерью в Петербурге. Там и познакомилась с Григорием Пушкиным, а в 1883 году вышла за него замуж. Обвенчались они в Вильно, но жили в Михайловском. И только в 1899 году насовсем перебрались в Маркути. Григорий скончался в 1905-м, Варвара — в 1935 году. Похоронены они рядом с домом, на семейном кладбище у часовни.

Сын поэта внимательно следил за всем, что появлялось в печати об отце, собирал и хранил все издания его сочинений. Варвара занималась общественной деятельностью, была членом Вильнюсского Рос-

сийского общества, помогала беднякам, воспитала и выучила нескольких сирот. Она любила вышивать, рисовать, стремилась сохранить в доме дух той эпохи, в которую жил великий поэт. Она и оставила завещание, по которому особняк в усадьбе Маркути должен был стать культурно-просветительным центром. [...]

Анфилада из шести комнат первого этажа сохранилась практически без изменений. Мебель в кабинете Григория и библиотеке декорирована гербами рода Пушкиных и инициалами Варвары. В книжных шкафах хранится около 600 томов. Жемчужиной Маркучяя можно назвать "уголок Пушкина" — так называется большая комната, стены и потолок которой обтянуты холстом, расшитым крепостными девушками из Михайловского. Здесь экспонируются личные вещи А. С. Пушкина. До наших дней сохранились также ломберный столик и два кресла. На стенах — семейные фотографии, портрет Натальи Гончаровой, выполненные Варварой рисунки с посмертной маски поэта. В шкафу красного дерева — прижизненные издания сочинений Александра Сергеевича, ставшие сегодня библиографической редкостью.

Вторая часть экспозиции "Жизнь и творчество А. С. Пушкина" отражает основные этапы жизни великого поэта, рассказывает о важнейших его произведениях. Здесь можно узнать о том, как распространялись книги Пушкина в Литве, как осуществлялись постановки произведений поэта в литовских театрах. Много материалов о дружбе А. Пушкина и А. Мицкевича.

После осмотра музея приятно побродить по тропинкам в тени раскидистых дубов, с крутого откоса полюбоваться панорамой древнего города, темнеющими вдали лесами Бельмонтаса и поразмышлять вот о чем. Мы живем в сложное время. Многое меняется, стремительно, прямо на глазах, ломаются привычные понятия и стереотипы. Человек часто не поспевает за временем, за этими переменами, и тогда, если он не научился наблюдать и анализировать, высказывает зачастую раздражение всем новым, непривычным. Торопимся заклеймить непонятное, навесить ярлык. И вот уже изменения в прибалтийских республиках в иных устах сводятся к понятиям типа "шовинизм" и "национализм". Конечно, не обходится, видимо, без перехлестов. Но повод ли это, чтобы осуждать само стремление маленького народа к национальному возрождению, реальному суверенитету? Давайте же научимся слушать происходящее, видеть в нем зерна завтрашнего дня, если хотим, чтобы он наступил. Ведь тот же музей великого Пушкина любовно и бережно отреставрирован литовцами; поговорите со студентами-филологами Вильнюсского университета, которые часто выступают экскурсоводами музея. Вы услышите гордость за причастность к судьбе великого поэта. А еще они прочтут вам стихи замечательной русской поэтессы Марины Цветаевой о нем, о Пушкине...

*1989*

*Ольга Залесская*

## ДОРОГА К ПУШКИНУ

“Пушкина надо не просто знать, не просто учить его стихи. Нужно знать массу мелочей, которые составляют понятие культуры, целый пласт наследия, который мы должны *продолжить*”.

Все оказалось гораздо проще, а потому и гораздо удивительнее. Георгий Василевич, директор музея-заповедника в Пушкинских Горах, будучи мальчиком, подростком, юношей, вовсе не являлся заядлым пушкинистом, ярым любителем или просто даже знатоком творчества Александра Сергеевича. И в Пушкинские Горы впервые попал так же, как девяносто девять процентов путешествовавших по бывшему Советскому Союзу.

Ему было тринадцать лет. Он с мамой сел в автобус. Приехал. Посмотрел. Уехал. И долго-долго после этого в Пушкинских Горах не бывал и, по его признанию, в общем-то не вспоминал эту поездку. Так почти и забылись пушкинские места: по специальности, которую получил Георгий в БГУ, он — политэконом, и десять лет отдал преподаванию в БПИ. Но случилось за эти годы одно знаменательное событие. Как любят писать в биографических романах, судьба неумолимо вела его к цели: в студенческие годы Георгий Василевич попал в стройотряд под Новоржев, что недалеко от Пушкинских Гор.

— Время было еще квартирьерское, — вспоминает Георгий. — Несколько человек, в том числе и я, были посланы авангардом для подготовки места проживания отряда. Мы выстроили кухню и решили, что три дня, оставшиеся до приезда стройотрядовцев, надо как-то убить. Сели в автобус и поехали смотреть музей. Я как человек, который там уже однажды побывал, считал себя чуть ли не старожилом. Сначала все было хорошо. А потом я перевел ребят по лавенке (так называется мосток из досок) над Соротью. И направились мы в Петровское, как мне казалось, самой короткой дорогой. Места там болотистые, топкие, и мы очень скоро были все в грязи. Встретили мальчика-рыбака. Он говорит: “Да нет, дяди, до места недалеко. Еще километров двенадцать”. Пришлось переплыть речку. Думаю, тогда я крещение и принял.

Мы, конечно, шли с бутылкой белого вина — отметить по-пушкински это дело. И вот достигли своей цели. Но опоздали на последний автобус из Петровского. А в Новоржев возвращаться надо. Это ни

много ни мало — почти сорок километров. Целую ночь шли пешком. Тут вино и пригодилось. Романтики было хоть отбавляй: ночь, звезды, лесистые места с медведями и кабанами, разбойники вот-вот нападут...

Спустя четыре года, в 1986-м, я туда поехал сам по себе. У меня накопились в душе вопросы, которые нужно было кому-то задать. И вот вспомнил, что есть такие места, где безумно красиво, где отбывал ссылку Пушкин. У меня был отпуск, и я захотел месяц поработать. Бесплатно.

— Но ведь ты ехал, никого не зная...

— Что значит: "никого не зная"? Я знал Пушкина. В тогдашнем Советском Союзе все знали Пушкина. И все знали Гейченко — директора Пушкинского музея. И все его любили. Я тоже любил. Успел прочесть книгу Семена Степановича и втайне надеялся познакомиться, хотя не думал, что этот номер пройдет. Однако знакомство состоялось. И работу мне дали: я должен был выстричь на еловой аллее (главной в Михайловском) ореховые кусты. С одним условием — чтобы было, как в Версале. "Ты знаешь, — спросил Семен Степанович, — как стригли кусты в Версале в эпоху Людовика XIV?" — "Да, — ответил я, — на картинках видел". — "Ну, раз видел, сделай так". И у меня получилось. Уезжая домой, я получил в подарок то, что не всякому дарилось, — портрет Семена Степановича.

В 87-м году я уже был в Михайловском три раза. Из года в год приезжал туда. Собирал мусор, убирал снег, листья, еловые лапки...

В 88-м встретил там Надежду, свою будущюю жену.

— Прошло 10 лет. И сейчас ты — директор этого заповедника. Каким же образом "вольноотпущенник минский", политэконом Георгий Николаевич, убиравший листья с аллей, не занимавшийся до того серьезной научной работой, не получивший "культурного" образования, стал директором заповедника в России, на тот момент уже другого государства, соседа Беларуси?

— На этот вопрос ответа не существует. Его можно задавать на протяжении всей жизни. Признано, что у Пушкина случайных вещей нет, но бывают странные сближения. За 80 лет существования заповедника директорами были люди разных специальностей. Но не было ни одного политэконома. Однако вспомним "Евгения Онегина". Там есть довольно прозрачный намек: "Зато читал Адама Смита, и был глубокий эконом". К тому же наступил такой момент, когда оказалось, что то, чему меня учили, очень нужно музею и музейному делу. Я знаю производство. А в Пушкинской усадьбе давно не было управляющего (кроме государства), и сложилась ситуация, когда мое умение стало нелишне. Я взял за данность то, что музей — сложное явление культуры, и постарался ответить на вопрос, что надо сделать для того, чтобы музей выжил. (Семен Степанович тогда тяжело болел.) В итоге в 1992 году появилась небольшая программа, в которой говорилось о том, ка-

ким бы я хотел видеть музей-заповедник. Она попала в Министерство культуры России. По-видимому, никто ничего другого предложить не мог, а в сознании людей еще жива была цельность России и Беларуси. Я проскочил в пространственно-временную щель, как тут же дверь со скрипом захлопнулась у меня за спиной. Раздался щелчок, и я оказался иностранцем на службе у российского государства. Потом рядом со мной появились новые люди, готовые идти не проторенной тропой, а новой дорогой.

Восприятие поэта такого уровня и такой величины как Пушкин всегда противоречиво. С одной стороны, он наш современник, наше достояние и наше *все*. С другой стороны, за ним всегда не поспеваешь. Именно потому, что ощущение — это наше *все* — нас настолько успокаивает! Мы ошибочно думаем, что никуда оно не денется. Дескать, никто никогда мимо *всего* не пройдет. В культуре, литературе, в жизни нельзя владеть тем, что внутри тебя живет. Пушкина надо не просто знать, не просто учить его стихи. Нужно знать массу мелочей, которые составляют понятие культуры, целый пласт наследия, который мы должны *продолжить*. К пенсии как-нибудь прочтем. С любовью оглаживаем обложку книги: "Вот еще один "Евгений Онегин". Вон уж сколько у меня накопилось". А когда все-таки начинаешь читать не потому, что это надо, а потому, что это надо *тебе*, понимаешь, что у тебя есть *свой* Пушкин.

Многим сегодня, увы, не до Пушкина. Правда, в связи с юбилеем (200-летие со дня рождения) чувствуется оживление. Помните его "Моцарта и Сальери"? Когда Моцарт приходит к Сальери, чтобы сыграть свое очередное произведение, Сальери произносит: "Ах, Моцарт, Моцарт, когда же мне не до тебя!" Так хочется быть поближе к гению, что вот убил бы его, только бы быть ближе. Мы очень близки к сальеризму, каким его описал Александр Сергеевич. Пушкина хочется взять себе навсегда, захапать...

— Извини, что перебиваю. Какой же музей ты хочешь построить?

— Пушкинские Горы — место, где Пушкин остался один на один со своим талантом, который едва его не придавил. Но Александр Сергеевич сделал маленькое чудо. Он "выстроил" в этом месте свой *дом*. Создал свой *мир*. Это место своего рода — поэтическая аномалия. Место, в котором что-то когда-то произошло. Пушкин расставил здесь свои вешки, возвел стены, сделал крышу. Как куполом, он своей поэзией отделил кусок пространства, времени... и до сих пор в нем живет.

В свое время Пушкин писал о Тригорском, а по сути — об этих местах: "Приют, сияньем муз одетый". Это, по существу, храм, в котором живут музы. Отсюда — музей. У Зевса и Мнемосины дочерей-муз было девять: Каллиопа — муза эпической поэзии, Клио — муза истории, Эвтерпа — покровительница лирической поэзии, Мельпомена —

муза трагедии, Терпсихора — муза танца, Эрато — муза любовной поэзии, Полигимния — муза пантомимы, Урания — муза астрономии. Перечитайте Пушкина — все музы сопутствуют ему во время ссылки. Так что здесь — особый музей. В общем-то вещественного наследия в нем сохранилось меньше, чем неуловимого духовного, подвигающего людей к творчеству. И все, кто более или менее причастен к нему, в пушкинских местах открываются по-своему: начинают писать стихи, прекрасные письма, картины. Это место, в котором культура продолжается. Она не мумифицирована, она живая. Поэтому я вижу свою задачу так: помочь преодолеть временной разрыв между нами и XIX веком, к которому мы относимся как к своей бабушке, помочь людям понять эпоху, чтобы продолжить непрерываемую нить культуры.

Вот мы готовимся к 1999 году — 200-летию со дня рождения Пушкина. Надо найти форму, которая позволит людям приехать в Михайловское и найти свою строчку, вписанную в историю праздника. И мы сейчас совершенно открыты для любых предложений. А в ближайшее время нам предстоит найти много сил, денег, людей и организовать работы, направленные на спасение уникальных парков заповедника. Войны и время уничтожили многое. Осталось лишь несколько деревьев, помнящих Пушкина.

Хочется сохранить, спасти старую часть парка. Необходим капитальный ремонт в усадебных домах, уточнение облика этих домов. Надо пополнить музейную коллекцию. И, наконец, развернуть культурно-рекламную работу. Когда-то Семен Степанович писал прекрасные книги. Сегодня же очень сложно найти на прилавках книгу о Пушкине, красивый календарь, открытки на пушкинские темы. Как и у всех директоров, у меня одна проблема: нужны деньги и люди. Ну и, конечно же, нам нужно общение.

На прощание Георгий рассказал импровизированную баечку. Приезжает Александр Сергеевич в 1999 году в Михайловское на каникулы. А народ уже суетится: поляну распахали, засеяли новой травой, трибуну сколотили. Писателей ожидают. Ходит Пушкин по своему Михайловскому. Сел на лавочку и думает: “Да, ничего с тех пор не изменилось. Комары те же, липы, вроде, тоже те же, что сын посадил после моей смерти (как сейчас помню). Мебель такую мы, правда, не заводили, ну да ладно. Кабинет, как с картины Ге. В принципе, ничего себе. Только... вот мне-то куда деваться?”

*1997*